Калі сусед практычна не карыстаецца сваім зямельным участкам і не супраць перадаць вам яго частку, застаецца толькі пытанне — якім чынам гэта зрабіць і дакументальна афарміць? СТАР 3

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі першым з беларускіх ВНУ цалкам пераходзіць на двухступеньчатую сістэму падрыхтоўкі кадраў па схеме 4 + 2... СТАР 3

Калі будучыя бацькі жадаюць атрымаць рэальныя шанцы з'яўлення здаровага дзіцяці, яны павінны вызначыць найлепшы перыяд для зачацця, разлічыць спрыяльныя моманты цяжарнасці... СТАР 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 САКАВІКА 2013 г. ЧАЦВЕР № 57 (27422) Кошт 1300 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

ПАД ЗНАКАМ ЭКАНОМІКІ

пройдзе вясновая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі

У прыкладнай сесійнай праграме і шэраг іншых пытанняў, важных для далейшага развіцця краіны, пра што «Звязда» даведалася ў старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ.

— Уладзімір Паўлавіч, мяркуючы па тым, што ў графіку падрыхтоўкі для разгляду на вясновай сесіі ўжо больш за шэсцьдзесят законапраектаў, Палата прадстаўнікоў, напэўна, мае намер удвая павялічыць каэфіцыент свайго карыснага дзеяння ў параўнанні з першай сесіяй. Значыць, этап псіхалагічнай адаптацыі нававыбраных дэпутатаў да заканадаўчай дзейнасці не зацягнуўся і яны на ўсю моц уключыліся ў заканатворчасць?

— Першая сесія была стартавай, і таму ў пэўнай ступені мела арганізацыйны характар, хоць і на заканатворчай ніве дэпутаты папрацавалі нядрэнна. Гэтая ж сесія цалкам будзе прысвечана заканатворчай рабоце, таму менавіта прапрацоўка нарматыўна-прававых дакументаў была нашым галоўным клопатам у міжсесійны перыяд.

— Што азначае прапрацоўка?

— Тое ж, што і «абкатка» розных меркаванняў. Абмеркаванне законапраектаў у рабочых экспертных групах, на пасяджэннях галаўной і ўсіх профільных камісій, а найбольш важных пытанняў — з выездам у рэгіёны, на прадпрыемствы і ў арганізацыі, кансультацыі са спецыялістамі, работнікамі міністэрстваў, ведамстваў і з грамадскасцю. Такая вось аб'ёмная, комплексная праца.

— Над якімі законапраектамі прыкладнага сесійнага графіка давялося папрацаваць даўжэй?

— Працаёмкасць у заканатворчасці не вымяраецца працягласцю падрыхтоўкі законапраекта, гэта катэгорыя найперш інтэлектуальная. Хаця, безумоўна, як правіла, большага рабочага часу вымагаюць кодэксы і базавыя законапраекты сістэмнага характару, але нярэдка доўжыцца і карэкціроўка дзейных законаў, здавалася б, вузкага карыстання. Чаму? Таму што многае залежыць ад навізны прававога рэгулявання тых ці іншых пытанняў, ад таго, наколькі яны праверацы рэальным жыццём, ці дасягнута згода розных інстанцый і спецыялістаў у дачыненні да прававых новаўвядзенняў. Мы робім упор на так званым нулявым чытанні законапраектаў не толькі для таго, каб палепшыць іх якасць, але і каб скараціць тэрмін ад іх распрацоўкі да прыняцця. У час падрыхтоўкі да другой сесіі профільнымі камісіямі і сакратарыятам Палаты прадстаўнікоў праведзена вялікая работа па ўсіх законапраектах базавага значэння, што, думаю, створыць пазітыўны дзелавы тонус сесіі.

— Які дыяпазон сесійнай тэматыкі?

— Самы буйны блок законапраектаў эканамічнай накіраванасці. Мяркуем прыняць рашэнні па такіх вельмі важных пытаннях, як інвестыцыі, канцэсіі, энергазберажэнне, супрацьдзеянне манапалістычнай дзейнасці і развіццё канкурэнцыі, натуральныя манаполіі, свабодныя эканамічныя зоны, выкарыстанне недраў, племянная справа ў жывёлагадоўлі, насенняводства, народныя промыслы (рамёствы), аўдыт, бухгалтарскі улік і справаздачнасць, дзяржаўнае рэгуляванне гандлю і грамадскага харчавання. Можна сказаць, што вясновая сесія пройдзе пад знакам умацавання заканадаўчай базы мадэрнізацыі эканомікі.

Аб'ёмнай будзе тэматыка па пытаннях судова-прававой сістэмы — канстытуцыйнае, гаспадарчае і грамадзянскае судаводства, судаўладкаванне, статус суддзяў і іншае.

У цэлым у ходзе сесіі абновіцца дастаткова шырокі абсяг заканадаўчага ландшафту, у тым ліку аб грамадскай бяспецы, ахове працы, ахове здароўя, працоўных і жыллёвых адносінах, фізічнай культуры і спорце. Павялічыцца нарматыўна-прававая база міжнароднага супрацоўніцтва.

Адзначу, што за шырокім комплексам законапраектаў сесійнага парадку дня — клопат пра паляпшэнне якасці жыцця ў краіне, дабрабыту людзей і рэалізацыю іх законных правоў і інтарэсаў. Мы працуем менавіта ў такім напрамку. СТАР 2

ВЯСНУ ГУКАЕМ, ВЯСНУ СУСТРАКАЕМ!

«Жавароначкі, прыляціце,
Вясну красну прынясіце,
А зімачку забярыце, у-у-у...»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Песняй-вяснянкай абудзілася ўчора дзіцячая дашкольная ўстанова «Светлячок» у аграгарадку Міханавічы Мінскага раёна. Тут гукалі вясну, сустракалі птушак — песнямі, карагодам, развешваннем папяровых птушак і частаваннем выпечанымі «жавараначкамі». Гэтак робяць у пасёлку штогод. Сёлета гурбы снегу на пляцоўцы дзіцячага сада вышэй за самых рослых выхаванцаў старэйшай групы, але традыцыя з-за гэтага не парушылася. Як адмовіцца ад мерапрыемства, якое з першымі промнямі вясновага сонца, абуджэннем прыроды, парою прылёту птушак само просіцца ў звыклы расклад дзіцячай установы. Для яго не патрэбны сцэнарыі, фанаграмы, спецэфекты, рэкамендацыі навукоўцаў. Патрэбна толькі жаданне. А яно ёсць і ва ўдзельнікаў вядомага дзіцячага фальклорнага калектыву «Калыханка» (на здымку), і тым больш у кіраўнікоў і выхавальнікаў «Светлячка». Як адмовіцца, калі свята само да іх просіцца? І яго правялі. СТАР 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар ШЧЭЦЬКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы:

«Новыя правілы забою жывёл для продажу ў асабістых падсобных гаспадарках дазволяць абараніць харчовы рынак краіны ад трапляння туды нявыкаснай прадукцыі. Паколькі толькі каля 30% мясной прадукцыі сёння рэалізуецца ўнутры краіны, а астатнія 70% пастаўляюцца на экспарт, нельга дапусціць выпадкаў узнікнення і распаўсюджвання розных небяспечных захворванняў жывёл. У такім выпадку мы можам страціць экспарт. Гэты захад, магчыма, і выкліча неадназначную рэакцыю той часткі насельніцтва, якая займаецца гадоўляй жывёлы для далейшай рэалізацыі, аднак ён цалкам апраўданы, паколькі дазваляе быць упэўненым у якасці вырабленай прадукцыі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.03.2013 г.

Долар ЗША	8660,00	▲
Еўра	11130,00	▼
Рас. руб.	280,50	▲
Укр. грыўня	1063,42	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 4°
Віцебск	+ 2°
Гомель	+ 1°
Гродна	+ 4°
Магілёў	– 3°
Мінск	0°

НАВУЧЫЦЦА ПРАФЕСІІ І ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА СЛУЖБЫ І НАДАЛЕЙ ДАПАМОЖА ДТСААФ

Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту мае доўгую гісторыю. Але, нягледзячы на ўсе выпрабаванні часу, галоўнае прызначэнне заставалася нязменным — выхаваць у маладым чалавеку патрыёта сваёй Радзімы, гарманічна развітую асобу, падрыхтаваць яго да абароны Айчыны. Учора адбыўся XIV рэспубліканскі з'езд таварыства, на якім падвялі вынікі пяцігадовай працы і акрэслілі кірункі на наступную пяцігодку. З'езд працаваў у Палацы Рэспублікі. А на пляцоўцы перад будынкам усе ахвотныя маглі паглядзець на вучэбную і спартыўную тэхніку арганізацыі.

Толькі за апошнія пяць гадоў цэнтральныя і рэгіянальныя арганізацыі таварыства правялі больш за дзесяць тысяч патрыятычных мерапрыемстваў. Але аб'яднанне багатае не толькі на духоўны «хлеб».

— Сёння таварыства можа прапанаваць заняткі ў гуртках па 19 тэхнічных відах спорту. Сярод іх картынг, мотабол, радыётэлеграф. Але галоўная наша задача — паказаць падлетку, які спецыяліст можа з яго атрымацца, якую добрую прафесію ў нас можна набыць, — мяркуе старшыня Цэнтральнага савета ДТСААФ, генерал-маёр запасу Іван Дырман. — Зараз членскія білеты арганізацыі маюць больш за 110 тысяч чалавек. І ў нашых планах павялічыць гэтую лічбу амаль удвая.

Гучна заяўляюць аб сабе спартсмены беларускага ДТСААФ на міжнароднай арэне. Пяць апошніх Кубкаў свету і Еўропы, а таксама разнастайныя чэмпіянаты прынеслі ў скарбонку таварыства 717 медалёў, з якіх 288 — найвышэйшай пробы. З яго сцен выйшлі амаль дзвесце майстроў спорту, а яшчэ чатырнаццаць спартсменаў атрымалі званне майстроў спорту міжнароднага класа. Восем арбітраў, падрыхтаваных у таварыстве, валодаюць найвышэйшай нацыянальнай катэгорыяй. Абсалютнымі чэмпіёнамі свету па хуткаснай радыётэлеграфіі сталі выхаванцы аб'яднання Ганна Шавяленка і Сяргей Швядко. Вядома, такія высокія дасягненні самым добрым чынам уплываюць на імідж краіны. Ёсць у таварыства добрыя справы і апроч спартыўных. За пяць гадоў абароннае таварыства падрыхтавала без малога трыста тысяч спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі, ільвіная доля якіх — кіроўцы аўтатранспарту. Прыкметна, што год ад году колькасць іх толькі павялічваецца. Маладыя людзі засвойваюць азы грамадзянскіх прафесій, рыхтуюцца да службы ў войску.

— Няпростая, але цікавая праца ДТСААФ з часам мяняе свае формы. Але напрацаваныя традыцыі і вопыт захоўваюцца. Узяць хаця б навучанне ў ваеннай сферы. Будучага вайскоўца загадзя вучаць спецыяльнасці і выкананню пастаўленых задач. Гэта эканоміць час на падрыхтоўку салдата ўжо ў арміі, — зазначыў Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Дзяржсакратар Савета бяспекі Леанід МАЛЬЦАЎ знаёміцца з выставай падчас правядзення XIV з'езда ДТСААФ.

Фота БЕЛТА.

КРЫХУ ЦЯПЛЕЙ, АЛЕ МОКРЫ СНЕГ І ДОЖДЖ

Сёння тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў скандынаўскага антыцыклону, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму чакаецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е, на асобных участках дарог слізка. Тэмпература паветра ў сярэдзіне дня ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Крыху цяплей уначы на пятніцу будзе па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — там толькі 3—8 градусаў ніжэй за нуль. Удзень у пятніцу ад мінус 2 да плюс 4 градусаў.

Пагаршэнне надвор'я (аднак стане цяплей) прагназуецца ў суботу, калі атмасферны фронт з боку паўднёвага захаду Еўропы прынясе да нас мокры снег і дождж. Такія ападкі будуць назірацца ўначы па паўднёвым захадзе краіны, а раніцай і ўдзень — ужо па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Цыклон выклікае месцамі сур'ёзны туман і галалёд, на дарогах галалёдзіцу. Маразы ўначы пачнуць слабець.

Чакаецца, што тэмпература паветра ўначы на суботу будзе вагацца ад мінус 2 градусаў па паўднёвым захадзе да 12 марозу па паўночным усходзе Беларусі. Удзень стане ад мінус 1 да плюс 5 градусаў. У нядзелю на ўсёй тэрыторыі краіны зноў чакаецца мокры снег і дождж, месцамі туман, галалёд, а на дарогах галалёдзіца. У ноч на нядзелю ўсяго ад 0 да мінус 6 градусаў, удзень ад мінус 2 да плюс 4, а па поўдні краіны і да 6 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Другая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу **2 красавіка 2013 года ў 10 гадзін** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала). Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **2 красавіка 2013 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ХАРВАТЫЯ «ЗАСКОЧЫЛА» Ў АПОШНІ ВАГОН

Харватыя выканала ўсе ўмовы, якія былі пастаўлены Еўракамісіяй для далучэння краіны да Еўрасаюза. Такім чынам, балканская краіна цяпер сапраўды стане 28-м членам ЕС. Па дамоўленасці, дата далучэння Харватыі была прызначана на 1 ліпеня 2013 года, перадаюць інфармагенцтвы са спасылкай на словы еўрапейскага камісара па пытаннях пашырэння і палітыкі добрасуседства Штэфана Фюле. На пазачарговым пасяджэнні ўрада Харватыі ў Заграбе Фюле прадставіў канчатковы даклад Еўрапейскай камісіі, у якім гаворыцца, што балканская краіна выканала ўсе ўмовы і патрабаванні ЕС ва ўсіх галінах і гатова стаць паўнапраўным членам гэтай арганізацыі. Пасля ўваходжання Харватыі ў Еўрапейскі саюз у 2013 годзе дзверы ЕС будуць закрыты для новых членаў на працяглы перыяд часу. У маі мінулага года маршал (старшыня) Сената Польшчы Багдан Барусевіч заявіў, што «Харватыя ўваходзіць у Еўрасаюз у апошні момант», пасля чаго наступіць працяглая паўза ў пашырэнні ЕС, што звязана з неспрыяльнай эканамічнай кан'юнктурай.

КНДР АДКЛЮЧЫЛА ЛІНІЮ ЭКСТРАННАЙ СУВЯЗІ З ПАЎДНЁВАЙ КАРЭЯЙ

Паўночная Карэя заявіла аб тым, што адключыла лінію экстраннай ваеннай сувязі з Паўднёвай Карэяй, якая выкарыстоўвалася для забеспячэння працы дэмілітарызаванай прамысловай зоны Кэсон. Па звестках АР, гэтая лінія сувязі з'яўлялася надзвычай важнай для зоны Кэсон, на тэрыторыі якой штодня працуюць паўночнакарэйскія і паўднёвакарэйскія рабочыя. У сераду з Паўднёвай Карэі ў Кэсон адправіліся каля 900 служачых прамысловых прадпрыемстваў. Ці паўплывае адключэнне сувязі на іх вяртанне, пакуль невядома. Раней Паўночная Карэя ўжо адключыла лінію сувязі Чырвонага Крыжа, аднак прамая лінія паміж ваенна-паветранымі сіламі дзвюх дзяржаў працягвае дзейнічаць. Таксама стала вядома, што КНДР папярэдзіла Савет Бяспекі ААН аб тым, што паўвостраў знаходзіцца на мяжы ядзернай вайны з-за «правакацыйных дзеянняў ЗША і іх паўднёвакарэйскіх марыянетак», перадае ССТV.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ПОЛЬШЧА РЫХТУЕЦЦА ВЫНЕСЦІ ЕЎРА НА РЭФЕРЭНДУМ?

Прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск заявіў аб магчымым рэферэндуме па пытанні ўвядзення еўра, хоць раней адмаўляўся ладзіць такі рэферэндум.

Польшча павінна ўвесці еўра па дагаворы аб уступленні ў ЕС. Каб замяніць польскі злоты на еўра, неабходна змяніць канстытуцыю краіны. У парламенце ўрад Дональда Туска мае нязначную большасць. Змяненне канстытуцыі павінны ўхваліць дзве траціны членаў ніжняй палаты парламента, таму ўраду неабходная падтрымка правай партыі «Права і справядлівасць». Раней гэтая партыя заяўляла, што без рэферэндуму не падтрымае ўвядзенне еўра.

Дагэтуль прадстаўнікі ўлады казалі, што паспрабуюць адпавядаць крытэрыям увядзення еўра, а афіцыйную дату ўвядзення агульнаеўрапейскай валюты абвесцяць пасля ўсеагульных выбараў 2015 года.

Праведзеныя нядаўна апытанні паказваюць, што 62% выбаршчыкаў не падтрымалі б увядзенне еўра. Эксперты прагназуюць, што Польшча ўвядзе еўра ў 2019 годзе.

КАРАТКА

У Беларусі за студзень-люты гэтага года зарэгістраваны 10 тыс. 331 шлюб, у параўнанні з адпаведным перыядам 2012 года іх стала больш на 21,3 працэнта. Змяншаецца колькасць разводаў: у студзені-лютым 2013 года скасаваны 5 тыс. 525 шлюбаў — разводаў стала менш на 12,2 працэнта ў параўнанні са студзенем-лютым 2012 года.

Рэспубліцы Беларусь будзе прадастаўлены грант на суму больш як 21 млн еўра для рэалізацыі праекта «Беларусь: эканалагічны інфраструктурны праект — першы этап».

Орган па сертыфікацыі прадукцыі, паслуг і персаналу «Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі» прыпыніў дзеянне шэрагу сертыфікатаў адпаведнасці на малдаўскія віны вытворчасці СП «Vinia Traian» АТ.

Як перадае афіцыйны сайт клуба БАТЭ, матч першага тура 23-га чэмпіянату Беларусі па футболе ў вышэйшай лізе паміж БАТЭ і мінскім «Дынама», які павінен быў адбыцца 31 сакавіка на гарадскім стадыёне Барысава, «у сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я» перанесены на стадыён «Тарпеда» горада Жодзіна.

БЕЛАРУСБАНК

Публичная оферта (предложение) о начислении поощрительного дополнительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 29 марта 2013 года поощрительный дополнительный процентный доход по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:

- **«Классик плюс», «Сберегательный», «Ваш выбор»** (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) - в размере **4% годовых**;
- **Накопительный, Премиально – накопительный «Детский» -** в размере **3% годовых;**
- **«Новый 2010» -** в размере **2% годовых.**

Начисление поощрительного дополнительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 29.03.2013 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 29.04.2013 (включительно).

Присоединение к остатку вклада поощрительного дополнительного процентного дохода производится 30.04.2013.

При этом поощрительный дополнительный процентный доход не выплачивается:

- в случае если в период с 29.03.2013 по 29.04.2013 (включительно) совершается возврат вкладчику суммы вклада (в том числе вкладов, срок возврата которых наступил в указанный период 2013 г.) или расходная операция, влекущая перерасчет причитающегося по вкладу дохода или первая расходная операция на основании свидетельства о праве на наследство;
- в случае если на 29.03.2013 по вкладу начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу начисляется в размере ставки вклада до востребования (в том числе по вкладам «Сберегательный» и «Новый 2010», срок возврата которых наступил до 29.03.2013).

Начисление дохода на сумму поощрительного дополнительного процентного дохода производится с 30.04.2013.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного дополнительного процентного дохода.

ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 29 марта 2013 года процентную ставку:

– по вновь принимаемым срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях **«Гарантированный доход»** на 15 дней — в размере **30% годовых** *(по ранее принятым вкладам установленный размер процентной ставки применять с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная с 29.03.2013);*

– по вновь оформляемым сберегательным сертификатам со сроком обращения 95 дней — **32% годовых;**

– основного дохода по вновь принимаемым срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях **«Интернет-депозит»** в размере **33,5%** годовых *(по ранее принятым вкладам установленный размер основного дохода применять с 29.04.2013).*

Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-центре по телефону 147 и на сайте www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912

ISSN 1990 - 763X

ПАД ЗНАКАМ ЭКАНОМІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— На ваш погляд, што неабходна дэпутату ў першую чаргу, каб яго ўдзел у заканатворчай дзейнасці быў карысным?

— Адчуваць пульс праблем, якія патрабуюць заканадаўчага рэгулявання. Умець іх дакладна сфармуляваць і прапанаваць рэальны шлях вырашэння. Гэта і ёсць тое, што называецца ўменнем працаваць у інтарэсах сваіх выбаршчыкаў.

— Гэтыя інтарэсы заўсёды супадаюць з дзяржаўнай воляй?

— Грамадска значныя абавязкова супадаюць. Гэта маё глыбокае перакананне, якое заснавана на асабістым жыццёвым, гаспадарчым і кіраўніцкім вопыце. Ды і на вопыце маіх калег. Таму ў практыку Палаты прадстаўнікоў і ўведзены пастаянны грамадскі дыялог. Пра некаторыя яго складнікі я ўжо сказаў у пачатку нашай гутаркі. Артыкуляцыя пазіцыі профільных камісій і дэпутацкага корпуса ў цэлым па базавым ці асабліва рэзанансным законапраекце адбываецца менавіта праз вывучэнне думкі тых, для каго ён напісаны і хто павінен будзе яго рэалізоўваць у сваёй рабоце. У кожнага дэпутата ёсць зваротная сувязь са сваёй выбарчай акругай, выкарыстоўваючы якую ён абмяркоўвае і выпрацоўвае свае прапановы заканатворчага і іншага характару. З гэтага года дэпутаты ўдзельнічаюць у паездках кіраўніка дзяржавы па рэгіёнах, што нацэльвае іх на тое, каб максімальна ініцыятыўна спрыяць вырашэнню мясцовых праблем, весці шчыры і адкрыты дыялог з людзьмі.

— У сесійным раскладзе застанецца «фортка» для паездак дэпутатаў у свае выбарчыя акругі?

— Абавязкова. Выязны тыдзень плануецца штомесяц.

— А што асабіста вам, Уладзімір Паўлавіч, даюць рэгулярныя рабочыя паездкі ў выбарчую акругу і па краіне?

— Дзелавую энергію, веданне жыцця людзей.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

■ Транспартны вектар

ПРАЕЗД ПАДАРАЖЭ, МАРШРУТЫ ЗМЕНЯЦЬ «ПРАПІСКУ»...

Павышэнне кошту праезду ў грамадскім транспарце сталіцы сёлета чакаецца двойчы. Спачатку з 1,7 тысячы да 2 тысяч рублёў, а пасля — да 2,3 тысячы рублёў. Пра гэта паведаміў журналістам падчас прэс-канферэнцыі ў Мінгарвыканкаме начальнік аддзела арганізацыі пасажырскіх перавозак дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь» Аляксей Касінскі. Пра канкрэтныя тэрміны пакуль казаць рана, бо гэтае рашэнне трэба ўзгадніць з Міністэрствам эканомікі.

Акрамя змен у кошце праезду, сетка гарадскога транспарту можа сутыкнуцца і з некаторымі карэктывамі маршрутаў. Гэта адбудзецца пасля таго, як будзе прынята канчатковае рашэнне аб змене функцыянальнага прызначэння сталічнага аўтавакзала «Маскоўскі».

— Гарадскія аўтобусныя маршруты, канцавым пунктам якіх з'яўляецца аўтавакзал «Маскоўскі», пойдуць на бліжэйшую дыспетчарскую станцыю «Славінскага», а для маршрутаў тралейбусаў ёсць напрацоўкі па ўсталяванні часткі тралейбуснай лініі па вуліцы Валгаградскай і праспекце Незалежнасці, — адзначыў Аляксей Касінскі.

Прыгарадныя, міжгароднія і міжнародныя маршруты, якія зараз адпраўляюцца з «Маскоўскага», таксама чакаюць змяненні.

— Што датычыць прыгарадных маршрутаў, то транспарт у Лагойскім і Маскоўскім кірунках будзе адпраўляцца з дыспетчарскай станцыі «Каліноўскага» без змены колькасці маршрутаў, — паведаміў **начальнік упраўлення арганізацыі перавозак дзяржпрадпрыемства «Мінсктранс» Сяргей ЯСІНСКІ**. — Маршруты Папярнянскага кірунку плануецца адпраўляць з дыспетчарскай станцыі «Карастаянавай». Міжгароднія і міжнародныя маршруты паедуць з аўтавакзала «Усходні» праз аўтавакзал «Цэнтральны». Праўда, тэрміны ажыццяўлення ўсіх вышэйакрэсленых змен адносна працы аўтавакзала «Маскоўскі» пакуль не вызначаны.

Колькасць людзей, у якіх ёсць уласны аўтамабіль, становіцца ўсё большай. У сувязі з гэтым працэнт аўтамабільных пасажырскіх перавозак значна зніжаецца, і гэта датычыць не толькі аўтавакзала «Маскоўскі».

— Функцыянальнасць гэтага аўтавакзала губляецца. Ён паціху ператвараецца ў прыгарадны, а ўтрыманне аб'екта прыносіць пэўныя цяжкасці, — адзначыў дырэктар філіяла «Мінскі аўтавакзал» дзяржпрадпрыемства «Мінсктранс» Віктар Палаўчэня.

Зніжэнне паказчыкаў па ўсіх відах пасажырскіх перавозак адзначаецца з 2008 года. Лічбы па міжгародніх перавозках знізіліся нязначна, а вось па прыгарадных — амаль у чатыры разы. Толькі попыт на міжнародныя рэйсы не ўпаў, асабліва папулярныя кірункі — краіны Балтыі і Польшча.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■

УРАД БЕЛАРУСІ АДОБРЫЎ КОМПЛЕКС МЕР ПА РАЗВІЦЦІ МАЛОГА І СЯРЭДНЯГА БІЗНЭСУ ДА 2015 ГОДА

Комплекс мер па дасягненні прагнозных паказчыкаў развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў абласцях і Мінску на 2013—2015 гады адобраны на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, праведзеным пад старшынствам прэм'-ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, перадае БелТА.

Дакумент падрыхтаваны Міністэрствам эканомікі пры цесным узаемадзеянні з бізнэс-супольнасцю.

У пералік увайшлі больш за 30 мерапрыемстваў, якія падзелены на пяць блокаў: інстытуцыянальнае развіццё прадпрымальніцкай дзейнасці; павышэнне ролі малога і сярэдняга бізнэсу ў мадэрнізацыі эканомікі; развіццё канкурэнцыі; спрашчэнне адміністравання і падаткаабкладання; удасканаленне нацыянальнай сістэмы дзелавой адукацыі.

Як адзначыў, прадстаўляючы дакумент, міністр эканомікі Мікалай Снапкоў, распрацаваныя мерапрыемствы накіраваны на стымуляванне прадпрымальніцтва, яго інтэнсіўнае развіццё і прадугледжваюць як удасканаленне заканадаўства, рэгулюючага агульныя пытанні вядзення бізнэсу, так і вырашэнне канкрэтных пытанняў прадпрымальніцкай дзейнасці ў асобных галінах і сферах эканомікі. У прыватнасці, запланаваны меры па абароне ўласнасці, развіцці канкурэнцыі, далейшым спрашчэнні падаткаабкладання і падатковага адміністравання.

Міністр нагадаў, што праграмай дзейнасці ўрада на 2011—2015 гады пастаўлена задача павялічыць долю малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў ВУП да 30 працэнтаў і забяспечыць колькасць занятых у гэтым сектары не менш як 1,8 млн чалавек да канца 2015 года.

Для дасягнення пастаўленай задачы Мінэканомікі сумесна з зацікаўленымі дзяржорганамі падрыхтаваны праект пастановы Савета Міністраў «Аб некаторых мерах па забеспячэнні развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь», якім устаноўлены прагнозныя паказчыкі развіцця малога і сярэдняга бізнэсу ў абласцях і Мінску на 2013—2015 гады, а таксама комплекс мер па іх дасягненні.

Падрыхтаваны праект пастановы павінен стаць адным з праграмных дакументаў урада, які вызначыць далейшыя крокі па лібералізацыі ўмоў вядзення бізнэсу з улікам прыярытэтаў, замацаваных Дырэктывай № 4.

«На наш погляд, дакумент дасць імпульс больш інтэнсіўнаму развіццю прадпрымальніцкага асяроддзя», — рэзюмаваў Мікалай Снапкоў.

Як адзначыў намеснік прэм'ер-міністра, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва Пётр Пракаповіч, адным з ключавых мерапрыемстваў, закладзеных у комплексе мер, з'яўляецца продаж па заяўным прынцыпе нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці і арандуецца суб'ектам гаспадарання больш за тры гады, а таксама ўвядзенне адміністрацыйнай адказнасці службовых асоб за неабгрунтаваную адмову або непрыняцце рашэння аб адчужэнні.

Старшыня РГА «Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя» Аляксандр Швец паведаміў, што дзелавая супольнасць падтрымлівае гэты комплекс мер. «Дзяржава бачыць, у якіх сектарах эканомікі трэба развівацца малому і сярэдняму бізнэсу. Гэта вельмі важна для прадпрымальніцтва», — падкрэсліў ён. Аляксандр Швец таксама агучыў шэраг найбольш актуальных для бізнэсу пытанняў, якія патрабуюць вырашэння ў бліжэйшай перспектыве.

У сваю чаргу прэм'ер-міністр адным з прыярытэтаў для малога і сярэдняга бізнэсу назваў кааперацыю з буйной прамысловасцю. «Я прапаную, каб сістэмаўтваральныя, горадаўтваральныя прамысловыя прадпрыемствы і сельгасарганізацыі садзейнічалі стварэнню малых і сярэдніх прадпрыемстваў, прыватных і прыватна-дзяржаўных, — заявіў Міхаіл Мясніковіч. — Сёння, напрыклад, не трэба, каб на нашых буйных прадпрыемствах займаліся абслугоўваннем або нейкімі іншымі другараднымі аперацыямі. Тут ёсць поле для ўзаемадзеяння».

Кіраўнік урада дадаў, што мадэрнізацыя на айчынных прадпрыемствах не абыдзецца без аптымізацыі колькасці персаналу. «У гэтым плане трэба ствараць цэлыя структуры па малым і сярэднім бізнэсе», — адзначыў ён. Таксама, паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, у рэгіёнах малы і сярэдні бізнэс можна актыўней прыцягваць у будаўнічую галіну.

У абмеркаванні пытанняў развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ва ўрадзе прынялі ўдзел прадстаўнікі бізнэс-супольнасці.

■ Футбол

ПАЧЫНАЕМ З ПАРАЖЭННЯ

Моладзевая зборная Беларусі па футболе саступіла аднагодкам з Ісландыі ў першым матчы адборачнага турніру чэмпіянату Еўропы-2015.

Ужо мінуў той час, калі шэраг нацыянальных зборных невялічкіх еўрапейскіх краін называлі сапраўднымі футбольнымі карлікамі. Так, у сваіх геаграфічных межах яны застаюцца малымі дзяржавамі, але добра гуляць у футбол у Еўропе навучыліся паўсюль. Вось і ў моладзевай зборнай Ісландыі ёсць футбалісты, якія выступаюць за юнацкія каманды італьянскага «Ювентуса», галандскага ПСВ «Эйндховена», дацкія і нарвежскія клубы.

Між іншым, беларусаў гэтыя маладыя вікінгі ў Жодзіне перамагалі ўпэўнена, з розніцай у два мячы. Праўда, дзякуючы трапнаму ўдару з пенальці Дзяніса Кавалеўскага ўзнікла надзея хаця б на нічыю, але паўночныя здолелі захаваць патрэбны для сябе лік — 1:2. Акрамя ісландцаў, беларусам за права ўдзельнічаць на кантынентальным першынстве ў 10-й групе будуць супрацьстаяць зборныя Арменіі, Францыі і Казахстана.

Нагадаем, што літаральна на днях галоўная зборная краіны пад кіраўніцтвам Георгія Кандрацьева правяла два таварыскія матчы. Спачатку ў Амане беларусы саступілі Іарданіі — 0:1, а пасля ў катарскай Досе перайгралі канадцаў — 2:0. Трапнымі ўдарамі ў гэтай сустрэчы вызначыліся Віталь Радзівонаў і Уладзімір Хвашчынскі.

Тарас ШЧЫРЫ

■

І Ў ПРЫБІРАЛЬНІ КРАДУЦЬ

У Наваполацку студэнтка вечарам паведаміла ў гарадскі аддзел унутраных спраў аб тым, што ў жаночай прыбіральні, размешчанай ў гандлёвым цэнтры, у яе выкралі дарагі смартфон. Высветлілася, што пакінуты без нагляду апарат коштам 4,5 мільёна рублёў скрала прадавачка крамы, 1982 года нараджэння. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

НА ЛІШКАХ МОЖНА ПАДЗАРАБІЦЬ

Арганізацыі спажывецкай кааперацыі краіны зацікаўлены ў набыцці ад насельніцтва сушаных грыбоў.

За кілаграм белых прапануецца 200-500 тысяч рублёў. За паўмільёна рублёў возьмуць сушаныя белыя грыбы першага гатунку, даўжыня ножкі і дыяметр шапачкі ў якіх не перавышаюць тры сантыметры, пры гэтым ніз шапачкі павінен быць белага колеру. Сушаныя чырвонагаловікі і ababкі спажыўкааперацыя гатова набываць па цане 100-200 тысяч рублёў за кілаграм. Зноў жа, закупачная цана вар'іруецца ў залежнасці ад памеру і якасці грыбоў.

Апроч гэтых дароў лесу, арганізацыі спажывецкай кааперацыі закупляюць у насельніцтва свежую бульбу і буракі (ад 1 тысячы рублёў за кілаграм), капусту (ад 1,8 тысячы рублёў), цыбулю (ад 2 тысяч рублёў), моркву (ад 1,2 тысячы рублёў), таварныя яблыкі (ад 3,5 тысячы рублёў за адзін кілаграм) і іншую сельскагаспадарчую, дзікарослую прадукцыю, а таксама другасную сыравіну (поліэтылен, макулатуру, металалом, шклабой). Закупачныя цэны на гэтыя віды прадукцыі, як паведамілі ў Белкаапсаюзе, залежаць ад яе якасці, рэгіёна (рэсурснасці) закупкі і наяўнасці канкурэнцыі на дадзенай тэрыторыі.

Здаць лішкі вырашчанай прадукцыі і сыравіны насельніцтва можна ў любым спажывецкім таварыстве ва ўсіх раёнах краіны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

І ЗНЕСЛІ БАЛЬНІЧНЫ БУДЫНАК

У гарадскім пасёлку Шаркаўшчына правялі першы ў Віцебскай вобласці раённы суботнік, на якім зарабілі каля 100 мільёнаў рублёў. Гэтыя грошы будуць накіраваны на добраўпарадкаванне раённага цэнтра.

У раённым суботніку бралі ўдзел больш як 5,6 тысячы чалавек. На тэрыторыі Шаркаўшчыны было праведзена прыбіранне снегу і лёду, быў знесены будынак былога інфекцыйнага аддзялення старой бальніцы. Нагадаем, што летась у Шаркаўшчыне адчынілася новая бальніца, а старая размяшчалася ў некалькіх будынках, у тым ліку пабудаваных яшчэ ў дарэвалюцыйны і даваенны часы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАСВАРЫЎСЯ З ЖОНКАЙ, ПАДПАЛІЎ ХАТУ ЦЕШЧЫ

Жыхар пасёлка Кажан-Гарадок Лунінецкага раёна пасварыўся з жонкай. Тая забрала дзяцей і пайшла жыць да маці. Муж прыходзіў, патрабаваў вярнуцца, пагражаў жонцы і цешчы. А калі ўгаворы і пагрозы не падзейнічалі, прыйшоў яшчэ раз з каністрай бензіну.

Дэбашыр разбіў акно, кінуў бензін у пакой, следам — запалку. У выніку пажару дому нанесены значны ўрон. Людзі не пацярпелі. Жонка, ведаючы буйны нораў сужэнца, загадзя схавалася з меншым дзіцем у суседзяў. У дачыненні да 46-гадовага зламысніка заведзена крымінальная справа.

КЛЕШЧ ГАЛОДНЫ І ЛЮТЫ

Першы выпадак укусу кляшча зарэгістраваны сёлета ў Брэсце. Брастаўчанка гасцявала ў выхадныя ў сваёй маці ў Валынскай вобласці, а прыехала дадому з кляшчом на целе.

Самае цікавае, што ў памежных раёнах Украіны тэмпература паветра такая ж, як у Брэсце, ноччу — да мінус 15-і. Але жанчына згадала, што маці прыносіла ў хату нованароджаных казлянят, каб паказаць іх унукам. Магчыма, з хлява яна прынесла і кляшча, які зімаваў у сене.

Энтамолаг Брэсцкага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Аляксандра Шырнюк заўважыла, што козы часта становяцца пераносчыкамі кляшчоў, заразіцца энцэфалітам можна нават праз малако, калі яго ўжываць негатаваным. Яшчэ спецыяліст папярэдзіла, што кляшчы прагаладаліся і з першым цяплом актывізуюцца. У мінулыя гады яны знаходзілі сабе ахвяры нават у лютым, а летась першага кляшча ў Брэсце зарэгістравалі 15 сакавіка.

Яна СВЕТАВА.

А ДЗЕ ДАКУМЕНТЫ НА ЗАПЧАСТКІ?

У Оршы супрацоўнікі падатковай інспекцыі ўстанавілі, што ў гандлёвым павільёне індывідуальнага прадпрымальніка рэалізоўваліся аўтамабільныя запчасткі без адпаведных дакументаў на іх. Не было дакументаў, якія пацвярджаюць набыццё або водпуск тавараў для рэалізацыі.

Па выніках праверкі былі арыштаваны і канфіскаваны аўтамабільныя запасныя часткі на суму больш за 157 мільёнаў рублёў.

Матэрыялы праверкі накіраваны ў Гаспадарчы суд Віцебскай вобласці для прыняцця рашэння ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ЛАЗНІ ДУРМАНІЛА НЕ ПАРА...

Супрацоўнікі аддзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Партызанскага РУУС сталіцы разам з байцамі спецпадраздзялення «Алмаз» МУС спынілі спробу спажывання наркотыкаў у адной з саўнаў Фрунзенскага раёна горада.

Міліцыянеры затрымалі пяцярых чалавек ва ўзросце ад 25 да 35 гадоў, якія ўжывалі ў саўне наркатычныя і псіхатропныя рэчывы. Сярод канфіскаванага ў затрыманых: гашыш, амфетамін, эфедрын. Усё пералічанае адносіцца да катэгорыі небяспечных наркатычных і псіхатропных рэчываў. Высветлілася, што затрыманыя ўжо былі раней асуджаныя за крадзяжы, вымаганне, махлярства і незаконнае абарачэнне наркотыкаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

В соответствии с условиями договоров банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенных на условиях, утвержденных протоколом Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» от 04.04.2006 №36 ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении с 02 мая 2013 года до 28,5% годовых размера процентной ставки по договорам банковского вклада (депозита) до востребования **«Пенсионный»,** заключенным в период с 04.04.2006 до 01.04.2013.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни. Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ

гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Вызволенье, деревне Пекалин, аг. Слобода, уч. №5, уч. №6, деревне Яворовщина Пекалинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	29 апреля 2013 года, в 15.00, д. Пекалин, ул. Ленина, 34, Пекалинский сельисполком, зал заседаний
3	Продавец и его адрес	Пекалинский сельисполком, д. Пекалин, ул. Ленина, 34
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	Лот № 1 – площадь 0,15 га № 624883601601000071 д. Вызволенье Лот № 2 – площадь 0,2033 га № 624883603601000235 д. Пекалин Лот № 3 – площадь 0,1423 га № 624883603601000245 д. Пекалин Лот №4 – площадь 0,1500 га № 624883604601000415 аг. Слобода уч. №5 Лот №5 – площадь 0,1500га № 624883604601000414 аг. Слобода уч. №6 Лот №6 – площадь 0,1500 га № 624883602101000065 д. Яворовщина
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания жилого дома
7	Начальная (стартовая) цена продажи	Лот № 1– 17 693 550 рублей Лот № 2 – 63 352 380 рублей Лот № 3 – 31 262 910 рублей Лот № 4 – 26 097 120 рублей Лот № 5 – 26 097 120 рублей Лот № 6 – 1 812 300 рублей
8	Условия аукциона	А) продажа по цене не ниже начальной Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9	Наличие инженерной инфраструктуры	д. Вызволенье – электроснабжение, д. Пекалин, ул. Приозерная – электроснабжение, водоснабжение, водоотведение, газоснабжение; д. Пекалин, ул. Ленина – электроснабжение, газоснабжение, асфальтированный подъезд; аг. Слобода, уч. №5 – подъезд, газоснабжение аг. Слобода, уч.№6 – подъезд, газоснабжение; д. Яворовщина – подъезд, энергоснабжение
10	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3600627070008 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино код 812, назначение платежа 04901 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
12	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками	Каждая среда в 12.00
13	Окончательный срок приема документов	23 апреля 2013 года в 17.00
14	Контактные телефоны	8 01776 61 624, 61 634, Vel 314 43 01

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Документ, подтверждающий внесение задатка на расчетный счет продавца.

3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

ОАО «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 8»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ПО СОСТОЯНИЮ НА 01.01.2013 г.

Актив	Код строки	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 года
I. Внеоборотные активы			
Основные средства:			
остаточная стоимость	110	324669	247739
Нематериальные активы:			
остаточная стоимость	120	18	3
Вложения в долгосрочные активы	140	25682	13283
Долгосрочные финансовые вложения	150	703	91
Долгосрочная дебиторская задолженность	120	120	
Итого по разделу I	190	351192	261116
II. Оборотные активы			
Запасы и затраты	210	87426	46815
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	21253	10958
Расходы будущих периодов	230	10135	4257
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	1519	2730
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	163850	87712
Краткосрочные финансовые вложения	260	151	
Денежные средства и их эквиваленты	270	24168	2712
Прочие краткосрочные активы	280	921	34
Итого по разделу II	290	309423	155218
Баланс	300	218165	398093
Пассив	**Код**	**На начало года**	**На конец отчетного периода**
III. Капитал и резервы			
Уставный капитал	410	53507	37627
Резервный капитал	440	373	374
Добавочный капитал	450	223841	162950
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	14826	3898
Итого по разделу III	490	292547	204849
IV. Долгосрочные обязательства			
Долгосрочные кредиты и займы	510	43250	56089
Доходы будущих периодов	540	124	13483
Итого по разделу IV	590	43374	69572
V. Краткосрочные обязательства			
Краткосрочные кредиты и займы	610	63681	26737
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	4879	
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	255956	115176
Обязательства, предназначенные для реализации	640	152	
Резервы предстоящих расходов	660	26	
Итого по разделу V	690	324694	141913
Баланс	700	660615	416334

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код строки	За январь-декабрь 2012 года	За январь-декабрь 2011 года
I. Доходы и расходы по видам деятельности			
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг в выручку)	010	925702	622975
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	832477	569798
Валовая прибыль	030	93225	53177
Управленческие расходы	040	56851	33361
Расходы на реализацию	050	769	517
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	35605	19299
Прочие доходы по текущей деятельности	070	149864	24019
Прочие расходы по текущей деятельности	080	159547	27975
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	25922	15343
Доходы по инвестиционной деятельности	100	1226	1402
Расходы по инвестиционной деятельности	110	401	636
Доходы по финансовой деятельности	120	6785	2097
Расходы по финансовой деятельности	130	16491	4094
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	150	-8881	-1231
Прибыль (убыток) до налогообложения	160	17041	14112
Налог на прибыль	170	4369	3933
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	124	67
Чистая прибыль (убыток)	210	12548	10112
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль	220	73271	114580
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-3	6
Совокупная прибыль (убыток)	240	85816	124698
Базовая прибыль (убыток) на акцию, руб.	250	934	971

УНП 200002603

ТРЫ НАЙЎНЫЯ ПЫТАННІ АБ САЦЫЯЛЬНЫХ НАВАЦЫЯХ

Мы выбралі тры пытанні, што прагучалі 26 сакавіка на анлайн-канферэнцыі Мінпрацы і сацабароны і БелТА «Сацыяльнае абслугоўванне насельніцтва». Яны тычацца новаўвядзенняў у гэтай галіне, якія найбольш абмяркоўваюцца.

Што ўяўляе сабой сацыяльны патранат і ці атрымаў ён ужо прапіску ў Беларусі?

Вось што адказала на гэтае пытанне **намеснік начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марына АРЦЁМЕНКА**:

Сацыяльны патранат — гэта дзейнасць па суправаджэнні грамадзян, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, накіраваная на яе пераадоленне, аднаўленне нармальнай жыццядзейнасці, мабілізацыю і рэалізацыю ўласнага патэнцыялу грамадзян для асабістага і сацыяльнага росту. Іншымі словамі, гэта ахоўная сістэма, якая наладжваецца для прадастаўлення розных відаў сацыяльнай дапамогі і падтрымання грамадзян (сем'яў), а таксама кантролю за тым, як гэтыя працэсы працякаюць.

Сацыяльны патранат разлічаны на сем'і, якія адчуваюць крызіс і не могуць самастойна вырашыць свае праблемы і справіцца з псіхалагічнымі нагрузкамі.

Для дапамогі кожнай канкрэтнай сям'і будуць прыцягвацца розныя спецыялісты, дзяржаўныя органы і арганізацыі.

Пастановай Саўміна ад 27 снежня 2012 г. № 1218 «Аб некаторых пытаннях аказання сацыяльных паслуг» зацверджаны пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг дзяржаўных устаноў з нормамі і нарматывамі забяспечанасці грамадзян гэтымі паслугамі. Вызначаны віды сацыяльнага патранату і перыядычнасць яго ажыццяўлення. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны распрацавала нарматыўныя і прававыя дакументы, у якіх вызначаны парадак аказання сацыяльных паслуг, у тым ліку паслугі сацыяльнага патранату, а таксама вызначана кампетэнцыя мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па стварэнні патранатнай рады для аказання такой паслугі. Зараз дакументы праходзяць юрыдычную экспертызу ў Міністэрстве юстыцыі.

Ці ўкараняецца ў Беларусі суправаджальнае пражыванне і ў чым яно заключаецца?

Суправаджальнае пражыванне — гэта новы від сацыяльных паслуг. Як паведаміў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК**, яно ўяўляе сабой аказанне садзейнічання:

дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, — у сацыяльна-працоўнай адаптацыі, пашырэнні сацыяльных сувязяў, вызначэнні аптымальных шляхоў арганізацыі самастойнага жыцця; а таксама інвалідам — у адаптацыі да ўмоў побыту і працоўнай дзейнасці, падрыхтоўцы да самастойнага жыцця па-за стацыянарнымі ўстановамі і далейшае іх суправаджэнне.

Тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва інвалідам будуць аказвацца наступныя паслугі:

— паслугі памочніка па суправаджэнні інваліда I групы з абмежаванай здольнасцю да руху;

— паслугі асістэнта інваліда I групы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (для адзінокіх інвалідаў і тых інвалідаў, якія пражываюць адны);

— паслугі перакладчыка мовы жэстаў для інвалідаў з парушэннямі слыху.

Для аказання такіх паслуг у тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва плануецца ствараць адпаведныя аддзяленні.

Гэтая паслуга замацавана ў пераліку бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання. Яна ўжо маецца ў Багушэўскім доме-інтэрнаце для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Віцебскай вобласці, дзе пры падтрымцы грамадскай арганізацыі «Свет без межаў» у жылых дамах, якія стаяць асобна, пражываюць 10 маладых інвалідаў і іх рыхтуюць да самастойнага жыцця. У Веснаўскім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Магілёўскай вобласці за кошт Ірландскай дабрачыннай арганізацыі створаны дом самастойнага пражывання для 12 дзяўчынак, у Гарадзішчанскім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця Брэсцкай вобласці 5 чалавек таксама атрымліваюць гэтую паслугу.

Акрамя таго, такая паслуга ўжо прадастаўляецца ў трох псіханеўралагічных дамах-інтэрнатах Брэсцкай вобласці (Целяханскі, Косаўскі, Жабчыцкі), двух — Магілёўскай вобласці (Быхаўскі і Каменскі) і ў псіханеўралагічным доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў № 3 г. Мінска.

Галоўнай мэтай адкрыцця такіх дамоў з'яўляецца адаптацыя дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў да самастойнага жыцця.

Ці запатрабаваны паслугі нянькі сем'ямі, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў? Што ўваходзіць у пералік паслуг, яны платныя ці бясплатныя?

Як заявіла Марына АРЦЁМЕНКА, цяпер паслугі па кароткачасовым доглядзе малалетніх дзяцей будуць прадастаўляцца таксама сем'ям, якія выхоўваюць двайнят, і сем'ям з дзецьмі-інвалідамі. У людзей ёсць попыт на іх, бо сем'і з такімі дзецьмі, як правіла, маюць патрэбу ў дадатковай дапамозе. А якой будзе статыстыка запатрабаванасці такіх паслуг — пакажа час. Зараз нарматыўныя і прававыя дакументы, якія рэгламентуюць прадастаўленне сацыяльных паслуг, праходзяць абавязковую юрыдычную экспертызу ў Міністэрстве юстыцыі.

Пастановай № 1218 прадугледжана прадастаўленне паслуг нянькі ў аказанні дапамогі ў доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 4 гадоў наступным катэгорыям сем'яў:

— няпоўным сем'ям, якія выхоўваюць дзіця-інваліда;

— сем'ям, у якіх выхоўваюцца двое і больш дзяцей-інвалідаў.

Паслугі нянькі названым сем'ям прадастаўляюцца бясплатна ў межах 20 гадзін на тыдзень і ўключаюць у сябе дапамогу ў доглядзе дзяцей разам з адным з бацькоў (кармленне, санітарна-гігіенічныя працэдуры, прагулкі і г.д). Акрамя таго, прадугледжана кароткачасовае (на працягу дня) вызваленне бацькоў ад догляду дзіцяці, у тым ліку за дзіцем-інвалідам (да 4 гадзін на тыдзень). Гэта значыць, на такі час бацькі могуць пакінуць дзяцей пад наглядам нянькі для вырашэння сямейна-бытавых пытанняў.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

ВЯСНУ ГУКАЕМ, ВЯСНУ СУСТРАКАЕМ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Народныя святы праходзяць у нас натуральна і душэўна. Яны арганічна ўпісваюцца ў распарадак і выхаваўчы працэс, — кажа загадчыца Міханавіцкай дашкольнай установы Ларыса Фамінчык. — Для дзяцей гэта і забава, і гульня, і змястоўнае баўленне часу на свежым паветры. Тым больш у такое сонечнае надвор'е, калі ў паветры моцнае адчуванне вясны.

У «Светлячку» кожны хацеў зрабіць свой унёсак у сустрэчу. Праўда, гэта пад сілу пакуль толькі старэйшым дзеткам. Група, у якой выхавальніцамі працуюць Вольга Малюкава і Ганна Матрунчык, падрыхтавала некалькі дзясяткаў рознакаляровых «жаваранкаў», якія цяпер упрыгожваюць тэрыторыю «Светлячка», лёгка пагойдваюцца на ветры.

Святы ў народным стылі нам дапамагаюць праводзіць дзеці — удзельнікі Міханавіцкага фальклорнага гурта «Калыханка». Калектывам ужо 24 гады кіруе жыхарка пасёлка, старшы выкладчык Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ларыса Рыжкова. Больш за тое, у калектыве ўдзельнічаюць таксама выхаванцы гэтага ж дзіцячага сада — як цяперашнія (напрыклад, Маргарыта і Раман Тарасавы, Арыяна Бераснева), так і былыя (цяпер яны школьнікі). Дарма, што малыя, — дзеці ведаюць шмат абрадавых песень, палюбілі народную спеўную манеру, шчаслівыя, калі апранаюць народныя строі. Вось адна з іх любімых вяснянак:

«Ой, чэрачко-пташачко,
Не залетай далечко,
Не занось майго венчыка,
Бо мой венчык — барвенчык,
Бо ён жа мне патрэбчык...»

«Калыханка» спявала і пачынала карагод, у якім месца хапала ўсім — і дзецям розных узростаў, і дарослым-выхавальнікам. Бо вясна — яна ж для ўсіх адна!

У канцы гэтай прыгожай гульні-свята ўдзельнікам раздалі выпечаных «жаваранкаў». Спрадвеку было такое частаванне, каб дзеці верылі ў цуды прыроды, верылі ў тое, што птушкі прынясуць на сваіх крыльцах нам вясну. Напякла птушачак Галіна Леўдаровіч, выдатны дзетсадаўскі кулінар. Ёй таксама вельмі хацелася зрабіць дзецям добрае свята.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Мінскі раён.

■ Грамадская думка

ІНВЕСТЫЦЫІ ПРЫЦЯГНЕ ВАДАЁМ?

Самы буйны штучны вадаём краіны — Вілейскае вадасховішча — можа стаць інвестыцыйна прыцягальным. Прынамсі, такімі перспектывы яго бачыць грамадскасць, якая брала ўдзел у апытанні, прысвечаным развіцці вадасховішча.

Ініцыятарам высвятлення грамадскай думкі выступіў Вілейскі раённы выканаўчы камітэт, куды не раз звярталіся зацікаўленыя грамадзяне з прапановай надаць гэтаму вадаёму рэкрэацыйную накіраванасць і павысіць яго інвестыцыйную прыцягальнасць. Апытанне цягам двух месяцаў праводзілася на сайце Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Нагадаем, што зараз асноўным кірункам рыбагаспадарчай дзейнасці Вілейскага вадасховішча з'яўляецца прамысловае рыбалоўства. Таксама на вадаёме магчымае бясплатнае аматарскае рыбалоўства.

Удзельнікам апытання прапаноўвалася выбраць адзін з некалькіх варыянтаў магчымага развіцця вадаёма. Як выказаліся рэспандэнты? За захаванне дзеючага кірунку прагаласавалі 17% апытаных. Перадаць вадасховішча аднаму арандатару для арганізацыі платнага аматарскага рыбалоўства прапанавалі 30,1% прадстаўнікоў грамадскасці, перадаць аднаму арандатару для арганізацыі платнага аматарскага і прамысловага рыбалоўства — толькі крыху больш за 2%. А вось за тое, каб выключыць любую арэнду вадаёма, але перадаць у арэнду зямельныя ўчасткі на яго берагах для будаўніцтва аб'ектаў па аказанні платных паслуг адпачывальнікам, выказаліся 50,5% тых, хто ўзяў удзел у праведзеным апытанні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГЛАБАЛЬНАЕ ЎЦЯПЛЕННЕ

У Гродне будуць вырабляць спецыяльныя прыборы для энергаэфектыўных дамоў

Гэта здарылася падчас маёй вучобы ў Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце. Так ён тады называўся і размяшчаўся на ўскраіне горада, непадалёк ад ракі Мухавец. Побач быў і наш інтэрнат, таму ў цёплыя дні многія студэнты адпраўляліся да вады, каб там пакупацца, пазагараць, а заадно — пачытаць канспекты.

Мне таксама ўсяго гэтага вельмі хацелася, але ж ... Вырасшы ў вёсцы, я проста не магла дазволіць сабе распрануцца ў прысутнасці чужых, а тым больш — малазнаёмых хлопцаў.

Што прыдумала: вырашыла пайсці па беразе ўніз па цячэнні (уверх — быў горад), знайсці нейкае бязлюднае месца і ўжо там адвесці душу — накупацца (а трэба сказаць, што плаваць я не ўмела).

Бераг Мухаўца быў абрывісты, высокі, месцамі пароснымі кустоўем, вада ў рацэ — цёмная, непразрыстая... Як тут купацца? Таму я ішла далей і далей.

А тым часам бераг стаў мякчэць, купіны пад нагамі ўсё глыбей апускацца ў ваду: я не заўважыла, як зайшла... у балота, з якога ўжо не выйсці... Прычым — не толькі ўперад, але і назад.

Я разгубілася, не ведаючы што рабіць. Прычым настолькі, што не адразу пачула, як да мяне... падплыла лодка. У ёй сядзелі двое маладых вайскоўцаў.

— Як ты тут апынулася? — строга спытаў адзін.

— Хацела пакупацца.

— А чаму не там? — ён паказаў рукой у бок «пляжа».

— Не хацела пры ўсіх распранацца.

Маё тлумачэнне было, відаць, пераканаўчым: хлопец працягнуў мне руку, і я (дарэчы, добрая спартсменка) ліха ўскочыла ў лодку. Мы моўчкі паплылі да супрацьлеглага берага, на якім — да радасці — было ўсё, што я шукала: жоўты пясочак, празрыстая вада і ніводнай жывой душы, бо выратавальнікі мае сказалі: «Купайся», а самі... зніклі гэтак жа нечакана, як і з'явіліся.

Мне б спытаць у іх, што далей, як потым дабрацца дамоў, але на душы было так хораша, так радасна, што я прамаўчала. Тым больш што ўдалечыні відаць быў мост... На ім — будачка з вартавым . Значыць, не прападу — неяк перайду на свой бераг?

Карацей, думаць пра нешта дрэннае мне не хацелася. Я плёскалася ў вадзе, грэлася на беразе і зноў купалася. Аж пакуль не стаў падымацца вецер, з боку моста не папаўзла цёмная страшная хмара...

І зноў я не паспела як след спалохацца: да майго берага і гэтак жа ціха прычаліла лодка — ужо другая, з іншымі хлопцамі-вайскоўцамі.

— Залазь, — скамандаваў адзін, — паедзеш дадому.

Лодка плыла хутка — веславалі памежнікі вельмі ўмела, са мной не размаўлялі. Прычалілі непадалёк ад майго інтэрната. Так што да пачатку навальніцы я дабегла дамоў.

...Не памятаю, якімі словамі дзячыла сваім збавіцелям. Ды і ці падзякавала ўвогуле. Але ж... Успамінаючы гэты выпадак, усё жыццё з цеплынёю думала і думаю пра памежнікаў, у нялёгкай службе якіх, ну вядома ж, ёсць месца подзвігам! Але ж ёсць яно і для добрых учынкаў.

Да таго ж прафесіяналы яны — найвышэйшага класа!

Ніла М., *Гродзенская вобласць*.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

■ Крымінал

ВЯРНУЎСЯ ЗА СВАІМІ ГРАШЫМА І... СКРАЎ ОФІСНЫЯ

Служачы адной са сталічных фірмаў абакраў уласнага працадаўцу на 16 тысяч долараў, інсцэніраваўшы пры гэтым узлом сейфа.

У адзін з дзён мужчына мусіў з паўдарогі вярнуцца зноў на працу: забыўся там кашалёк. Калі ён зайшоў у офіс, убачыў, што дзверцы дырэктарскага сейфа прыадчыненыя. Падышоў бліжэй, зазірнуў у металічную «скрыню» і ўбачыў унутры буйную суму грошай. І, пакольк сведак не было, рукі, можна сказаць, самі пацягнуліся да валюты... Забраўшы грошы, мужчына вырашыў інсцэніраваць праніканне ў офіс. Для гэтага ён манціроўкай вырваў са сцяны сейф, узламаў шклопакет і раскідаў па памяшканні.

Як паведамілі ў Кастрычніцкім РУУС сталіцы, ужо дома работнік усвядоміў, што зрабіў. Аднак прызнавацца і вяртаць скрадзеныя грошы не стаў. Замест гэтага закапаў 16 тысяч долараў у падвале і пачаў чакаць. Аднак ужо праз тыдзень асобу зламысніка ўстанавілі і мужчыну затрымалі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

Пасвячэнне ў бабулі па-шаркаўшчынску

Традыцыя «катаць бабу» з нагоды нараджэння ўнука захавалася ў Шаркаўшчынскім раёне.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ОАО «Проминвест»

Адрес: 220015, г. Минск, ул. Я. Мавра, д. 33а, к. 1, тел. (017) 216-17-29, УНН 100646457
ФИО руководителя: Крук Владимир Михайлович,
ФИО главного бухгалтера: Свирина Светлана Олеговна
Среднесписочная численность работающих: 97 человек
Основной виды деятельности: розничная торговля

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31.12.2012 г.

млн руб.

Наименование показателя	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 года	Наименование показателя	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			**III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**		
Основные средства	118	127	Уставный капитал	37	37
ИТОГО по разделу I	**118**	**127**	Добавочный капитал	125	125
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	216	209
Запасы	3 619	2 819	**ИТОГО по разделу III**	**378**	**371**
Расходы будущих периодов	549	24	**IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**		
Краткосрочная дебиторская задолженность	174	150	Доходы будущих периодов	63	63
			ИТОГО по разделу IV	**63**	**63**
			V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА		
Краткосрочные финансовые вложения	7	7	Краткосрочные кредиты и займы	400	385
Денежные средства и их эквиваленты	318	222	Краткосрочная кредиторская задолженность	3 886	2 532
			Обязательства, предназначенные для реализации	63	-
Прочие краткосрочные активы	15	23	Резервы предстоящих платежей	10	21
ИТОГО по разделу II	**4 682**	**3 245**	**ИТОГО по разделу V**	**4 359**	**2 938**
БАЛАНС	**4 800**	**3 372**	**БАЛАНС**	**4 800**	**3 372**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь-декабрь 2012 г.

млн руб.

Наименование показателей	За 2012 год
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	28 151
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	22 892
Управленческие расходы	857
Расходы на реализацию	4 349
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	**53**
Прочие доходы по текущей деятельности	16
Прочие расходы по текущей деятельности	25
Прибыль (убыток) до налогообложения	**44**
Налог на прибыль	8
Чистая прибыль (убыток)	**36**

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Ед. изм.	2012 год	2011 год
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн руб.	24,4	18,3
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	400	300
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	6,20	6,08
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	61000	61000

ООО «Ивкон Бизнес Технолоджис», УНП 191438067, ликвидируется. Претензии принимаются в течение 2-х месяцев с момента опубликования по тел. + 375 29 5800690.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ

ОАО «МОНТАЖЛЕГМАШ» за 2012 год

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 года

АКТИВ		ПАССИВ	
Наименование статей	Сумма, млн. руб.	Наименование статей	Сумма, млн. руб.
Долгосрочные активы	20 171	Собственный капитал	47 004
Краткосрочные активы	53 518	Обязательства	26 685
БАЛАНС	**73 689**		**73 689**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2012 ГОД

Наименование показателей	Единица изм.	Сумма
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	млн руб.	132 500
Сальдо прочих доходов от текущей деятельности	млн руб.	1367
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы	млн руб.	101 504
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой, иной деятельности	млн руб.	1836
Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности		
Кол-во акций, находящихся на балансе	шт.	0
Просроченная кредиторская задолженность	млн руб.	2419
Просроченная дебиторская задолженность	млн руб.	9594

Основные виды деятельности:
Производство металлоконструкций, строительно-монтажные работы

Аудиторское заключение

По мнению аудиторской организации ООО «АудитБизнесКонсалт» бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Монтажлегмаш» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение на 1 января 2013 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2012 год, при этом совершенные ОАО «Монтажлегмаш» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

ОАО «Минский завод отопительного оборудования»

Адрес: 220073, г. Минск, ул. Тимирязева, 29, тел. 203 12 25, 210 22 39, факс 203 14 20

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 г.

Единица измерения: млн руб.

АКТИВ	Код стр.	На 31 декабря 2012	На 31 декабря 2011
1. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	150990	135752
Нематериальные активы	120	14	9
Вложения во внеоборотные активы	140	337	768
Прочие внеоборотные активы	150	12	12
Прочие долгосрочные активы	180	19508	13919
Итого по разделу 1:	**190**	**170861**	**150460**
2. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	130135	88146
Расходы будущих периодов	230	941	1231
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	4336	4980
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	17843	30815
Денежные средства и их эквиваленты	270	4289	3214
Прочие оборотные активы	280		7568
Итого по разделу 2:	**290**	**157544**	**135954**
Баланс:	**300**	**328405**	**286414**
ПАССИВ			
3. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный капитал	410	59755	7030
Резервный фонд	440	93	93
Добавочный фонд	450	50124	94329
Нераспределенная прибыль	460	357	2729
Итого по разделу 3:	**490**	**110329**	**104181**
4. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	14833	31885
Прочие долгосрочные обязательства	520		1062
Резервы предстоящих платежей	550	13	
Итого по разделу 4:	**590**	**14846**	**32947**
5. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	126765	62272
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	10473	
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	65988	79458
в том числе:			
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	253	168
Доходы будущих периодов	650	4	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	7556
Итого по разделу 5:	**690**	**203230**	**149286**
Баланс:	**700**	**328405**	**286414**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	Код стр.	За январь – декабрь 2012 г.	За январь – декабрь 2011 г.
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	502091	309216
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	427876	276126
Управленческие расходы	040	29798	
Расходы на реализацию	050	10153	
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	34264	33090
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	27019	2393
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	150	(25267)	40
Прибыль (убыток) до налогообложения	160	1752	2433
Налог на прибыль	170	1102	1379
Прочие налоги и сборы исчисляемые из прибыли (дохода)	200	42	543
Чистая прибыль (убыток)	210	608	511

Данные отчетности подтверждены ООО «Белросаудит» (лицензия № 02200/0495344 выдана Министерством финансов Республики Беларусь, срок действия до 25.02.2014 г.)

Информация о дивидендах и акциях, количестве акционеров, задолженности по состоянию на 1 января 2013 г.

Показатель	Ед. измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	2497	2762
в том числе: юридических лиц	лиц	5	6
физических лиц	лиц	2492	2756
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн. руб.	251	164
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	714	467
Обеспеченность акции имуществом общества	руб.	313881	284421
Количество акций, находящихся на балансе общества	штук	нет	нет
Просроченная дебиторская задолженность	млн руб.	1698	нет
Просроченная кредиторская задолженность	млн руб.	6632	нет
Среднесписочная численность работающих	человек	1483	1592

Основные виды продукции, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации – производство радиаторов отопительных чугунных.

Директор ***И.Е.Омельченко***

Главный бухгалтер ***А.С.Карпович***

ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко»

220013, г. Минск, ул. Я. Коласа, 38/16, к. 2, тел.: 209 41 11, 285 76 22

лицензия № 02200/13-00025, 19.01.2011 г. – 26.03.2014 г., выдана МФ РБ, Учетный номер плательщика 101063229

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 года

Единица измерения: тыс. руб.

АКТИВЫ	Код строки	На 1 января 2013 года	На 31 декабря 2011 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	37 873 532	2 988 490
Нематериальные активы	120	28 649	40 142
Доходные вложения в материальные активы	130	136 395 344	115 969 823
в том числе: инвестиционная недвижимость	131	130 608 183	110 014 777
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	5 787 161	5 955 046
прочие доходные вложения в материальные активы	133		
Вложения в долгосрочные активы	140		
Долгосрочные финансовые вложения	150	1 392 240	
Долгосрочная дебиторская задолженность	160		
Отложенные налоговые активы	170		
Прочие долгосрочные активы	180		
Итого по разделу I	**190**	**175 689 765**	**118 998 455**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	1 004 460	763 241
в том числе: материалы	211	1 004 460	763 241
незавершенное производство	212		
прочие запасы	213		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	215		
Расходы будущих периодов	220	373 033	3 035 724
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	230	2 002 577	82 185
Доля перестраховщиков в страховых резервах	240	121 934	38 447
в том числе: резерв незаработанной премии	241	79 980	12 518
резервы убытков	242	41 954	25 929
другие технические резервы	243		
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	55 438 381	18 717 034
Краткосрочные финансовые вложения	260	305 918	2 493 471
Денежные средства и их эквиваленты	270	45 937 820	44 702 913
Прочие краткосрочные активы	280		
Итого по разделу II	**290**	**105 184 123**	**69 833 015**
Баланс	**300**	**280 873 888**	**188 831 470**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	на 1 января 2013 года	на 31 декабря 2011 года
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	10 752 750	10 752 750
Неоплаченная часть уставного капитала	420		
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430		
Резервный капитал	440	1 241 642	783 411
в том числе резервный фонд заработной платы	441		
Добавочный капитал	450	129 154 621	87 836 758
в том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов	451		
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	12 571 539	4 842 421
Чистая прибыль (убыток) отчетного период	470		
Целевое финансирование	480		
Итого по разделу III	**490**	**153 720 552**	**104 215 340**
IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ			
Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни	500		
Резерв незаработанной премии	501	7 781 997	7 718 550
Резерв убытков	502	16 694 987	14 872 247
Другие технические резервы	503		
Иные страховые резервы	504		
Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	505	9 242 885	9 099 416
Гарантийные фонды	506		
Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством	507		
Итого по разделу IV	**509**	**33 719 869**	**31 690 213**
V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	56 799 102	29 016 250
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	4 345 878	6 273 534
Отложенные налоговые обязательства	530		
Доходы будущих периодов	540		
Резервы предстоящих платежей	550		
Прочие долгосрочные обязательства	560		
Итого по разделу V	**590**	**61 144 980**	**35 289 784**
VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610		783 000
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	32 288 325	16 839 042
в том числе: страхователям	631	2 984 189	418 355
страховым агентам и брокерам	632	1 437 502	1 033 361
прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования	633	89 468	74 093
по операциям перестрахования	634		
депо премий по рискам, переданным в перестрахование	635		
поставщикам и подрядчикам	636	6 749	1 562
по авансам полученным	637		
по налогам и сборам	638	2 015 394	540 747
по социальному страхованию и обеспечению	639	151 688	103 991
по оплате труда	640	582 984	585 727
по лизинговым платежам	641		
собственнику имущества (учредителям, участникам)	642	46 886	3 692
прочим кредиторам	643	24 973 465	14 077 514
Обязательства, предназначенные для реализации	650		
Доходы будущих периодов	660	162	14 091
Резервы предстоящих платежей	670		
Прочие краткосрочные обязательства	680		
Итого по разделу VI	**690**	**32 288 487**	**17 636 133**
Баланс	**700**	**280 873 888**	**188 831 470**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь—декабрь 2012 года

Единица измерения: тыс. руб.

Наименование показателей	Код строки	за январь—декабрь 2012 года	за январь—декабрь 2011 года
ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ			
Страховые взносы (страховые премии) полученные, брутто	010		
Страховые выплаты	020		
Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или -)	030		
Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	040		
Расходы на ведение дела	050		
Доходы и расходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни	055		
Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (строки 010 - 020 + 030 - 040 - 050+-055)	060		
ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ			
Страховые взносы (страховые премии) полученные, брутто — всего	070	238 705 402	125 288 862
в том числе: по прямому страхованию и сострахованию	071	237 212 985	124 792 612
по рискам, принятым в перестрахование	072	1 492 417	496 250
Страховые премии по рискам, переданным в перестрахование, брутто	073	1 072 417	374 924
Страховые взносы (страховые премии) с учетом перестрахования, нетто (строки 070 - 073)	074	237 632 985	124 913 938
Изменение доли перестраховщиков в резерве незаработанной премии	080	(63 447)	2 567 710
Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (итог строк 080 и 081)	081	67 462	(62 813)
Заработанные премии, нетто (итог строк 074 и 082)	082	4 015	2 504 897
Оплаченные убытки (страховые выплаты), брутто	085	237 637 000	127 418 835
Доля перестраховщиков в убытках (страховых выплатах)	090	144 085 760	110 703 364
Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования, нетто (строки 090 - 091)	091	2 194	23 225
Изменение резервов убытков (страховых выплат), брутто	092	144 083 566	110 680 139
Изменение доли перестраховщиков в резервах убытков (страховых выплат)	095	(1 822 740)	(181 424)
Изменение резервов убытков (страховых выплат) с учетом перестрахования, нетто (итог строк 095 и 096)	096	16 025	(5 395)
Заработанные премии за вычетом страховых убытков (страховых выплат) (строки 085 - 092 + 097)	097	(1 806 715)	(186 819)
Изменение других технических резервов	100	91 746 719	16 551 877
Изменение иных страховых резервов	110		
Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	120		
Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством	130	237 735	128 798
Расходы на ведение дела, всего	140		
в том числе: комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	150	57 954 082	41 935 874
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	151	174 502	109 115
Доходы и расходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни	155	54 368	17 603
Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (строки 100 + 110 + 120 - 130 - 140 - 150 + 155 +- 160)	160	16 914 320	8 166 517
Доходы по инвестиционной деятельности	170	50 523 590	(17 328 675)
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	180	8 045 107	17 836 312
доходы от участия в уставном капитале других организаций	181	26 741	71 265
проценты к получению	182		
прочие доходы по инвестиционной деятельности	183	1 726 048	117 700
Расходы по инвестиционной деятельности	184	6 292 318	17 647 347
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	190	29 005 112	16 036 419
прочие расходы по инвестиционной деятельности	191	24 396	59 626
Доходы по финансовой деятельности	192	28 980 716	15 976 793
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	200	74 033 981	113 244 628
прочие доходы по финансовой деятельности	201	15 046 056	81 621 317
Расходы по финансовой деятельности	202	58 987 925	31 623 311
в том числе: проценты к уплате	210	76 316 417	93 618 299
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	211	2 349 098	
прочие расходы по финансовой деятельности	212	14 721 655	62 904 479
Иные доходы и расходы	213	59 245 664	30 713 820
Прибыль (убыток

■ Рэпрадуктыўная тэма

БЫЎ БЫ ПЛАН... А ДЗЕЦІ БУДУЦЬ!

Найбольш аптымальны і пажаданы ўзрост для жанчын пры планаванні першай цяжарнасці — 21-26 гадоў. Да гэтага моманту палавое выспяванне завяршаецца, гарманальны фон дастатковы, арганізм малады, хранічныя захворванні, як правіла, адсутнічаюць, тканкі звязак і суставаў эластычныя, што аблягчае нармальнае працяканне цяжарнасці і родаў. Аднак у многіх краінах свету ўзрост жанчын, якія чакаюць першае дзіця, павялічваецца. І набліжаецца да 30-35 гадоў.

— У логіцы позняга мацярынства ёсць свае важкія плюсы і мінусы, — кажа **загадчыца жаночай кансультацыі 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Святлана МАЛЯЎКА.** — Станоўчае тое, што жанчына плануе цяжарнасць свядома, мае пэўную матэрыяльную базу, жыллё, працу, урэшце, яна больш падрыхтаваная ў псіхалагічным сэнсе... Адмоўнае ж тое, што з узростам здольнасць да зачацця ўсё ж такі зніжаецца. Акрамя таго, пагаршаецца агульны стан здароўя, павялічваюцца выпадкі розных негатыўных генных змяненняў на ўзроўні палавых клетак. У выніку з'яўляюцца прыроджаныя захворванні, генетычныя парушэнні, парокі развіцця ў дзіцяці. Часцей у гэтым узросце з'яўляюцца і ўскладненні. Пасля родаў могуць узнікнуць новыя хранічныя захворванні...

Узрост бацькі таксама адбіваецца на здароўі дзіцяці. Мужчыны больш схільныя да стрэсаў, уздзеяння неспрыяльнай экалогіі, негатыўных наступстваў курэння і ўжывання спіртных напояў, фізічнай і псіхічнай перагружанасці на працы. І менавіта таму ў 30-40-гадовых мужчын, як правіла, ужо значна зніжана здольнасць да апладнення.

ШТО РАБІЦЬ, КАБ ЛЕПЕЙ ЗАЧАЦЬ?

Калі будучыя бацькі жадаюць атрымаць рэальныя шанцы з'яўлення на свет здаровага дзіцяці, яны павінны вызначыць найлепшы перыяд для зачацця, максімальную яго верагоднасць, разлічыць спрыяльныя моманты для ўсяго перыяду цяжарнасці і своечасовага завяршэння яе лёгкімі родамі. Дакладней...

...не выкарыстоўвайце сродкі кантрацэпцыі як мінімум за 3 месяцы, паколькі некаторыя рэчывы аказваюць працяглы эфект на арганізм і могуць перашкодзіць зачаццю дзіцяці;

...жанчына павінна дакладна ведаць тэрміны сваіх месячных і дні авуляцыі;

...майце на ўвазе, што найбольш спрыяльныя дні для зачацця — за 16-14 дзён да пачатку наступнага месячнага цыкла. Але ў прынцыпе цяжарнасць можа наступіць у любы дзень. Гэта залежыць ад асаблівасцяў цыкла жанчыны і ад фертыльнасці (здольнасці да апладнення) мужчыны.

...абое павінны адмовіцца ад шкодных звычак. У будучага бацькі павінны выспець здаровыя сперматазоіды. Таму неабходна як мінімум на працягу трох месяцаў устрымацца ад курэння, алкаголю і тым больш не мець справу з наркотыкамі.

...пажадана таксама ўлічыць і спрыяльныя фактары для нармальнага працякання цяжарнасці. Да такіх момантаў можна аднесці:

— пачатак штогадовага адпачынку варта разлічыць так, каб максімальна пазбегнуць стамляльных пераездаў, змены кліматычных паясоў, некамфортных умоў, якія могуць не лепшым чынам паўплываць на дзіця на любым этапе развіцця;

— пазбяганне стрэсавых сітуацый перад зачаццем і падчас цяжарнасці;

— здаровы лад жыцця, які ўключае харчаванне, фізічную актыўнасць, душэўную раўнавагу, змену цяжкай і шкоднай для здароўя работы;

— паўнацэнны штодзённы адпачынак;

— своечасовы медыцынскі агляд будучых бацькоў перад зачаццем, лячэнне хранічных захворванняў.

ЯКІЯ ДАСЛЕДАВАННІ НЕАБХОДНЫЯ ПЕРАД ЗАЧАЦЦЕМ?

Мужчына і жанчына павінны звярнуцца да ўчастковага тэрапеўта для праходжання агляду і абследавання. Маюцца на ўвазе агульны агляд, здача агульных аналізаў, замер артэрыяльнага ціску. Варта прайсці агляд і ў стаматолага, паколькі любыя праблемы з зубамі могуць негатыўна адбіцца на развіцці і стане будучага малога.

Абавязкова неабходна здаць аналізы і прайсці абследаванне на палавыя інфекцыі (мікаплазмоз, хламідыёз, урэаплазмоз, вірус герпесу, цытамегалавірус, сіфіліс, ганарэя, трыхаманіяз і інш.). Гэтыя інфекцыі могуць выклікаць шэраг праблем і адхіленняў, у тым ліку бясплоднасць як у жанчын, так і ў мужчын. Выяўленыя інфекцыі абавязкова неабходна поўнасцю пралячыць.

Калі жанчына схільная да запаленчых працэсаў органаў малога тазу (яны могуць узнікаць па розных прычынах, у тым ліку пасля абортаў і пасля перанесеных палавых інфекцый), то перад зачаццем неабходна схадзіць да гінеколага, каб выявіць паталогію праходнасці матачных труб і тым самым зменшыць шанцы наступлення пазаматачнай цяжарнасці.

Трэба памятаць пра такую недапушчальную інфекцыю, як краснуха. Калі жанчына не рабіла прышчэпку або не ўпэўнена ў тым, што прышчэплена ад краснухі, то можна здаць аналізы на наяўнасць антыцелаў да краснухі, а магчыма, і прышчапіцца.

Да зачацця пажадана зрабіць аналіз крыві і на антыцелы да таксаплазмозу. Гэтае захворванне ўзнікае ў выніку жыццядзейнасці кашэчых паразітаў і правакуе сур'ёзныя парушэнні ўнутрывантробнага развіцця.

Калі ў жанчыны ёсць розныя хранічныя захворванні (сардэчна-сасудзістыя, цукровы дыябет, парушэнні гарманальнага фону і эндакрыннай сістэмы, варыкознае расшырэнне вен і інш.), неабходна параіцца з урачом адносна іх уплыву на цяжарнасць і самой цяжарнасці на працяканне гэтых захворванняў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Інфарм-укол

Кожная дзяўчынка павінна ведаць...

Чысціня цела — першачарговае ў асабістай гігіене. На скураных покрывах размяшчаюцца вывадныя пратокі потавых і сальных залоз, назапашваюцца лускавінкі скуры, пыл, мікраарганізмы. Скураны тлушч, кампаненты поту, лускавінкі скуры забіваюць поры і сальныя залозы, парушаюць функцыі скуры, што з'яўляецца спрыяльным асяроддзем для мікробаў. Бруд, які назапашваецца на скуры, здольны выклікаць скурныя захворванні (гнайнічковыя, грыбковыя), пагоршыць аб'ём скурнага дыхання і расстроіць тэрмарэгуляцыю.

Паводле слоў **валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ,** рэкамендуецца штодня, лепш за ўсё раніцай і вечарам, мыцца цёплай вадой з мылам і мачалкай. Лепш за ўсё пад душам, у праточнай вадзе. Мыццё ў ванне з пункту гледжання гігіены, горш, паколькі чалавек знаходзіцца ў непраточнай вадзе, забруджанай мікробамі, тлушчам, салямі поту, пылам... Таму пасля мыцця ў ванне неабходна апаласнуцца пад душам.

Падчас менструацыі інтымнай гігіене трэба надаваць асаблівую ўвагу. У гэтыя дні палавыя органы асабліва ўспрымальныя да інфекцый з-за пэўнага зніжэння ахоўных сіл арганізма. Кроў — ідэальнае асяроддзе для жыцця і размнажэння бактэрый. У гэты час неабходна дасканала абмывацца праточнай вадой з прымяненнем розных сродкаў гігіены. Наведваць лазню і прымаць ванну не рэкамендуецца. Бялізну трэба мяняць штодня. Спрынцаванні похвы не рэкамендуюцца, асабліва падчас месячных, паколькі похва мае ўласнае хімічнае мікраасяроддзе, якое абараняе ўнутраныя палавыя органы ад паталагічнага ўздзеяння мікраарганізмаў. Пракладкі трэба мяняць не радзей як 4-5 разоў на дзень, абмывацца — 2-3 разы на дзень. У іншыя дні — не радзей за 1 раз на дзень.

На развіццё дзявочага арганізма адмоўна могуць паўплываць:

1. Няправільны рост шкілета ў школьніц, які прыводзіць да скрыўлення пазваночніка. Для дзяўчынак гэта больш небяспечна, чым для хлопчыкаў, паколькі пазваночнік злучаецца з тазам, і яго скрыўленне прыводзіць да парушэння раўнамернай нагрузкі на таз, які з цягам часу змяняе сваё становішча і форму, што ў будучыні можа прывесці да ўскладненняў у родах. Такой праблеме спрыяе, з аднаго боку, няправільнае становішча за сталом або партай у школе і дома, а з другога — працяглае знаходжанне ў становішчы седзячы. З першых жа дзён наведвання школы неабходна сачыць за тым, каб дзяўчынка сядзела правільна: прама, не нахіляючыся над кнігай і не ўпіраючыся ў край стала.

2. Дзіцячыя інфекцыйныя хваробы ў школьным узросце спрыяюць не толькі агульнаму аслабленню арганізма, але і могуць ускладніцца стойкім пашкоджаннем некаторых органаў (сэрца, нырак, печані і г.д.). Таму варта рабіць усё, каб прадухіліць падобныя захворванні.

3. Перагрузкі, гіпадынамія, рэдкае знаходжанне на свежым паветры — не на карысць. Вельмі важна разумна чаргаваць заняткі ў школе і хатнія заняткі з адпачынкам і актыўнымі гульнямі, прагулкамі.

4. Фізічныя перагрузкі недапушчальныя. Перагружаць дзяўчынку фізічнай працай нельга. Аднак неабходна прывучаць яе да некаторых абавязкаў (удзел у гатаванні, мыццё посуду, выціранне пылу, прыбіранне ўласных рэчаў, догляд і чыстка абутку і г.д.). У старэйшых класах пералік работ можна пашырыць.

5. Недастатковае, малакаларыйнае і аднастайнае харчаванне — злачынства супраць арганізма, які актыўна развіваецца. Харчаванне павінна быць не толькі разнастайным, але і вітамінізаваным.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Крытыка на шпільках

САРДЭЧНЫЯ ТАЯМНІЦЫ КЛАСІКА

Нядаўна трапіла мне ў рукі кніга Дзяніса Марціновіча «Донжуанскі спіс» Караткевіча»... Часткі яе чытала і раней — тэкст друкаваўся ў інтэрнэце і стаў своеасаблівай сенсацыяй: якніяк гэта першы расповед пра жанчын, у якіх у свой час быў закаханы наш класік Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч.

Але гэтым разам адно месца ў тэксце моцна мяне развесяліла.

Марціновіч прыгадвае ў сваёй кнізе словы ўкраінскага пісьменніка Міколы Амельчанкі пра тое, што малады Караткевіч Ніне Молевай — жонцы слыннага расійскага мастака-авангардыста Элія Бялюціна — «нярэдка дапамагаў матэрыяльна, купляў падарункі». І, мяркуючы па тэксце караткевічаўскага рамана «Нельга забыць», у аснову якога пакладзены складаныя ўзаемаадносіны з гэтай жанчынай, Молева, хутчэй за ўсё, таксама магла зрабіць яму падарунак — рэпрадукцыю Бацічэлі (пра гэта згадвае ў аповесці сам беларускі пісьменнік).

Вось што тут смешнага, — спытаеце вы.

А тое, што жанчына, пра якую піша ў сваёй кнізе Дзяніс Марціновіч, тая самая Ніна Молева — гераіня нядаўняй медыйнай гісторыі пра ўнікальны хатні музей, у якім, як сцвярджаюць газеты, налічвалася каля тысячы мастацкіх прадметаў і жывапісных палотнаў, сярод якіх называюць працы Мікеланджэла («Галава фаўна»), Рубенса («Вакханалія», «Сусанна і старцы»), Леанарда да Вінчы («Мадонна з кнігай»),Тыцыяна («Марыя Магдаліна, якая каецца»), Данатэла («Бюст родзіча Медычы»), Рэмбранта («Продаж правоў першародства»), Ван Дэйка («Партрэт Сусаны Фоўрмэн»), а таксама творы Эль Грэка, Міколы Пусэна, Мурылья, Веранэзэ, Веласкеса.

Уладальніца гэтай выдатнай па маштабах калекцыі, якая ацэньваецца ў мільёны доларaў — тая ж самая жанчына, якой Караткевіч дапамагаў матэрыяльна! Дарэчы, гэты неверагодны факт — наяўнасці такога збору каштоўнасцяў у руках адной творчай сям'і — быў добра вядомы нашаму славутаму пісьменніку.

Па-першае, Ніна Молева — не звычайная жанчына, а выкладчыца гісторыі мастацтва ў Літінстытуце, дзе вучыўся наш будучы класік на Вышэйшых літаратурных курсах. Яна — слынны мастацтвазнаўца, цяпер ужо ўдава мастака Элія Бялюціна, чыё імя ў 1960-я гг. чуў амаль кожны чалавек, бо ён быў арганізатарам і ўдзельнікам славутай выставы ў Манежы, якую ў 1962-м у пух і прах разнёс Мікіта Хрушчоў. Па-другое, сам Караткевіч сведчыў у рамане, што ён быў у гасцях у пары Молева — Бялюцін.

«Апусціўшы вочы, яна сказала:

— Хадзем, я пакажу вам карціны.

Другі пакой быў трохі святлейшы. Наборны італьянскі стол, глянсава-белы, з чорнымі, быццам гравіраванымі малюнкамі. Нізкія, трохі вышэй калена, шафы для кніг, на іх — статуэткі.

Бронзавая старажытнакітайская карова ляжала на жываце і касавурылася на Андрэя.

А над шафамі, быццам дзясяткі вокан у свет, свяціліся карціны. Цяжкія, нават на выгляд, дошкі старых абразоў ззялі барвяным, густа-сінім, прасвечвалі руковым праз блакітнае, як жывое цела праз тканіну.

Цяжкаватымі, трошкі чыгуннымі фарбамі і незвычайнасцю ліній стракацелі палотны мадэрністаў.

Цёплым празрыстым лакам, быццам вадой карычневай лясной ракі, былі ахутаны цьмяныя чалавечыя фігуркі на даўніх італьянскіх і нідэрландскіх карцінах. Гэтыя фігуры былі такімі цёплымі, што, здавалася, працягні руку і нават вобмацкам адчуеш жывую плоць.

І адна карціна ззяла нават сярод іх нейкім блакітным, месячным сяйвам. А на гэтым сяйве вымалёўваліся постаці людзей, што сыходзілі па сходах у сад.

— Наша жамчужына, — сказала яна. — «Выхад у Гефсіманскі сад».

— Хто? — спытаў Андрэй, здагадваючыся ўжо аб усім.

— Малады Рэмбрант». *(«Нельга забыць».)*

Шчыра кажучы, каб не кніга Дзяніса Марціновіча «Донжуанскі спіс» Караткевіча», дзе распавядаецца пра лёс жанчыны, якая стала прататыпам гераіні «Нельга забыць» Горавай, то я і да гэтай пары лічыла б, што гэта фрагмент рамана — мастацкае перабольшванне, творчая фантазія Уладзіміра Караткевіча.

Але што сапраўды ўражвае, дык гэта тое, што беларускі пісьменнік не толькі ведаў пра гэты збор шэдэўраў заходнееўрапейскага мастацтва, але і папаўняў яго! У кнізе Марціновіча чытаем сведчанне ўжо згаданага вышэй Амельчанкі пра тое, што Караткевіч паабяцаў Молевай купіць нейкую карціну «моднага імпрэсіяніста», паабяцаў і купіў. Пры гэтым на карціну гэтую пісьменнік пазычаў грошы і ў свайго ўкраінскага сябра, і ў Барыса Мажаева. А на другі дзень, застаўшыся літаральна без граша ў кішэні, хадзіў да іх есці!

...Здавалася б — нязначная для гісторыі літаратуры падрабязнасць прыватнага жыцця. Але, з другога боку, як нам не хапае такіх падрабязнасцяў, жывой дэталі, якая б дазволіла па-іншаму паглядзець на класікаў, адчуць, як яны жылі, чым дыхалі, каго любілі, а часам нават абагаўлялі! У кнізе Марціновіча шмат цікавых імёнаў, шмат рамантычных узнёслых гісторый, якія, пры ўсёй пікантнасці тэмы, пададзены з вялікім тактам і мудрай далікатнасцю. Мяркуючы па ўсім, даследчыку яшчэ ёсць што дадаць да жыццяпісу Караткевіча, так што кніга, хутчэй за ўсё, будзе пашырацца.

На жаль, «Донжуанскі спіс» Караткевіча» Дзяніса Марціновіча — літаральна першая ластаўка ў такім незвычайным напрамку даследавання, як рэканструкцыя жыцця паводле дакументаў і ўважлівага прачытання тэксту. На шчасце, за ўзнаўленне гісторыі любоўных адносін узяўся чалавек хоць і малады, але вельмі дасведчаны, прафесійны гісторык з літаратуразнаўчым талентам.

Ганна КІСЛІЦЫНА

ШЧАСЛІВАГА ПОСТКРОСІНГУ!

У Магілёве адкрылася выстава паштовак «Увесь свет у паштовай скрыні».

Выстава арганізавана ў цэнтральнай бібліятэцы імя Маркса. Паштоўкі, прадстаўленыя на ёй, атрыманы дзякуючы посткросінгу. Гэта міжнародны праект, у якім задзейнічаны жыхары больш як 200 краін свету. З дапамогай інтэрнэт-сайта людзі дасылаюць паштоўкі выпадковым адрасатам з розных краін і таксама атрымліваюць іх.

У выніку ствараюцца цэлыя калекцыі, адну з якіх і прадставіла ў Магілёве Марына Гуслева, маладая супрацоўніца гарадскога аддзела культуры.

— Я займаюся гэтым ужо цэлы год і сабрала больш за сотню розных і цікавых паштовак, — расказала Марына. — Я вельмі люблю паштоўкі з рознай літаратурнай тэматыкай, але яшчэ больш цікава, калі людзі нешта пішуць пра сябе, сваё жыццё і свае мары. Аднойчы мне даслаў паштоўку амерыканец, які расказаў, як двойчы перамог рак і, як той знакаміты Армстронг, заняўся веласіпедным спортам, паехаў у падарожжа па краіне. Ад такога адразу ўзнікае жаданне жыць і працаваць.

У бібліятэцы выстаўлены ў асноўным розныя серыі беларускіх паштовак. Аднак у красавіку выстава, якая зацікавіла многіх наведвальнікаў і саміх бібліятэкараў, пашырыцца. У ёй з'явяцца паштоўкі з іншых краін, для ўдзелу ў выставе запросяць і іншых аматараў посткросінгу.

Колькасць удзельнікаў праекта ў свеце набліжаецца да 400 тысяч чалавек, а ў Беларусі перавысіла 16 тысяч. Наша краіна ўваходзіць у дзясятку краін-лідараў у посткросінгу, і папулярнасць яго ўсё павялічваецца.

Ілона ІВАНОВА.

■ Твая стыхія

ПРАВЕРЫМ ЛАГІЧНУЮ І МЕХАНІЧНУЮ ПАМЯЦЬ

Вы можаце абсалютна самастойна навучыцца даследаваць найскладанейшы псіхафізіялагічны механізм арганізма — памяць. Давайце паспрабуем вызначыць каэфіцыент **лагічнай,** або сэнсавай, памяці.

Паспрабуйце запомніць 15 пар слоў, паміж якімі абавязкова павінна быць сэнсавая сувязь.

1. Зіма — холад
2. Хмара — дождж
3. Нож — рэзаць
4. Лес — сасна
5. Трэнер — спорт
6. Альбом — маляваць
7. Венік — пыл
8. Дыплом — маладзец
9. Ноч — цемра
10. Сонца — цеплыня
11. Цягнік — ехаць
12. Маліна — прысмак
13. Марыць — верыць
14. Неба — вясёлка
15. Спяваць — мелодыя

Вы можаце прыдумаць і свае пары слоў. Далей заданне лепей выконваць наступным чынам. Вядучы зачытвае гэтыя пары слоў з інтэрвалам паміж парай у 2-3 секунды. Слухачы павінны запомніць словы строга ў парах. Праз 10 секундаў вядучы чытае словы толькі левай паловы пары. Слухачы запісваюць на паперы ў строгай паслядоўнасці словы правай паловы пары. Калі слухач не запомніў пару да нейкага слова, то ставіць прочырк. Затым вядучы яшчэ раз зачытвае словы левай і правай паловы, што дазваляе вызначыць, наколькі дакладна слухачы запомнілі словы правай паловы.

Цяпер вызначаем каэфіцыент нашай лагічнай памяці. Колькасць слоў, якія мы запомнілі, дзелім на 15 (колькасць слоў левага слупка). Калі вы са слоў правага слупка правільна запомнілі 10, то ваш каэфіцыент лагічнай памяці роўны 10:15=0,6. Зразумела, што найлепшы каэфіцыент — 1.

Для вызначэння **механічнай** памяці зноў будзем запамінаць пары слоў. Цяпер у правым слупку павінны адсутнічаць сэнсавыя сувязі, што абцяжарвае хуткае і дакладнае механічнае запамінанне.

1. Малаток — вясна
2. Хваля — страказа
3. Жадаць — страла
4. Туфлі — надзея
5. Сарока — трывога
6. Перашкода — прысмак
7. Чайнік — хуткасць
8. Вецер — дыван
9. Грыбы — спазніцца
10. Сумка — палёт
11. Задавальненне — пчала
12. Прозвішча — вышыня
13. Загадка — локаць
14. Сіні — апавяданне
15. Імкненне — учора

Выконваем усё такім жа чынам, як і падчас даследавання лагічнай памяці. Такім жа чынам падлічваем каэфіцыент нашай механічнай памяці.

Хачу падзяліцца некаторымі вынікамі сваіх эксперыментаў і назіранняў у справе запамінання блізкіх па сэнсе і абсалютна розных слоў. Лепш за ўсё з лагічнай, «вобразнай» памяццю — у людзей, народжаных **пад знакам Зямлі,** меланхолікаў (1 студзеня — 19 студзеня, 20 снежня — 31 снежня) і **Вады,** флегматыкаў (20 лютага — 19 сакавіка, 20 чэрвеня — 19 ліпеня, 20 кастрычніка — 19 лістапада).

Прычым Вадзяныя цудоўна могуць спраўляцца і з запамінаннем механічнага характару, чаго не скажаш пра Зямных. Зямным варта ўдасканальваць лагічную памяць. На запамінанне хаатычнай, неканкрэтнай, фрагментарнай інфармацыі людзі Зямлі затрачваюць шмат энергіі. І гэта можа прывесці да пэўнага дыскамфорту, стрэсу і нават шэрагу захворванняў.

Лепш засвойваюць абстрактнае народжаныя **пад знакам Агню,** халерыкі (20 сакавіка — 19 красавіка, 20 ліпеня — 19 жніўня, 20 лістапада — 19 снежня) і асабліва **Паветра,** сангвінікі (20 студзеня — 19 лютага, 20 мая — 19 чэрвеня, 20 верасня — 19 кастрычніка). У Вогненных і Паветраных значна хутчэй у арганізме працякаюць хіміка-біялагічныя працэсы, яны маюць рухавую псіхафізіялагічную структуру. Наогул у іх адсутнічаюць устойлівыя стэрэатыпы ўспрымання свету. Яны могуць за кароткі час перапрацаваць вялікі аб'ём інфармацыі і захаваць пры гэтым свежую свядомасць. Аднак Вогненныя і Паветраныя здольны лёгка забыць большую частку атрыманай інфармацыі. Проста ім лёгка даецца запамінанне аб'ёму — без асаблівага асэнсавання таго, што менавіта запамінаецца. Такі механічны спосаб запамінання абараняе мозг ад нервовага перанапружання. Аднак для пазбягання іншых праблем людзям Агню і Паветра варта вучыцца канцэнтраваць увагу на асобных фактах, вылучаць важнае і аналізаваць гэта.

Сяргей АНУПРЫЕНКА, доктар філасофскіх навук.

■ Дзякуй за прафесіяналізм

Шанцаў на выжыванне заставалася мала

Наша сям'я хацела б выказаць велізарную сардэчную падзяку медперсаналу аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі Мінскай гарадской дзіцячай інфекцыйнай бальніцы — загадчыку аддзялення Максіму Ачарэтнаму, лечачаму ўрачу Валянціну Загорскаму, урачам Святлане Рэут, Вікторыі Комер, Вользе Рошчынай, Святлане Бабаевай, медсёстрам Вікторыі Церах, Вераніцы Дзядзечцы, Святлане Шпакоўскай, Юліі Скакун, Галіне Кулікоўскай, Ірыне Абрамчык, Таццяне Горбаль, працэдурнай медсястры Галіне Нікановіч, старшай медсястры Аксане Кіжык.

У студзені захварэў наш сын Антось (яму 2,5 годзіка). Менінгакокцэмія. Шанцаў на выжыванне было мала. Дзіця падключылі да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, ён быў на моцных кардыятоніках, на дыялізе (з-за вострай ныркавай недастатковасці). Праз тыдзень у яго быў паўторны септычны шок. Каля трох тыдняў наша дзіця было паміж жыццём і смерцю. Але ўрачы выхадзілі нашага Антоську. Дзіця было ў рэанімацыі паўтара месяца. Мы штодня бачылі, як прафесійна, з якой самаддачай урачы і медсёстры дапамагалі нашаму сыну, як яны перажывалі, калі Антосю станавілася горш, як шчыра радаваліся, калі ён пайшоў на папраўку. Ніводзін чалавек, які працуе ў аддзяленні, не застаўся абыякавым да нашай бяды. І гэта давала нам веру ў тое, што ўсё будзе добра. Дзякуй усім вам за бяссонныя ночы, чулае стаўленне да пацыентаў, найвысокі прафесіяналізм.

Асобныя словы ўдзячнасці — галоўнаму ўрачу бальніцы Марыне Сакаловай і яе намесніку Тамары Ліпніцкай. Мы дзякуем таксама і ўрачу хуткай дапамогі Дзянісу Маісеенку, фельчару Ягору Калініну, вадзіцелю Аляксандру Коршунаву, паколькі ад іх дзеянняў у першыя гадзіны хваробы таксама залежала жыццё нашага дзіцяці.

З павагай, сям'я Рэцкіх (мама Марына, тата Эдзік і сын Антось).

■ Вясна будзе!

ЛЯСГАСЫ РЫХТУЮЦЦА ДА СЕЗОНА БЯРОЗАВІКУ

Сёлета лясгасы краіны плануюць нарыхтаваць 27,7 тысячы тон бярозавага соку. Для параўнання: летась было нарыхтавана і рэалізавана 26,6 тысячы тон бярозавіку, што на амаль 1,5 тысячы тон больш, чым у 2011 годзе.

Як бачым, з кожным годам Мінлясгас «уздымае планку». Калі колькі гадоў таму «ўраджай» у больш чым 10 тысяч тон лічыўся ледзьве не рэкордным, дык сёлета, напрыклад, толькі ў планах лясгасаў Мінскага лесагаспадарчага аб'яднання нарыхтаваць 8 тысячы тон, у Брэсцкага — 7,2 тысяч тон бярозавіку. Праўда, як адзначаюць у міністэрстве, не павелічэнне аб'ёмаў нарыхтовак турбуе леснікоў, а магчымасці айчынных перапрацоўчых прадпрыемстваў.

Пакуль заяўкі ёсць ад трох дзясяткаў перапрацоўшчыкаў, якія гатовы прыняць 20,2 тысячы тон соку. Аднак, я сведчыць вопыт мінулых гадоў, не ўсе прадпрыемствы выбіраюць замоўленыя аб'ёмы. І тады даводзіцца тэрмінова шукаць выйсце, паколькі сок — прадукт, які хутка псуецца.

Таму лясгасы павінны шукаць іншыя магчымасці рэалізаваць бярозавік. Летась, напрыклад, арганізацыі Мінлясгаса ўпершыню пастаўлялі яго на экспарт у Літву. Туды было накіравана 239,5 тоны соку.

Актыўна ідзе продаж бярозавіку і насельніцтву. Акрамя таго, што сок можна было набыць у лясніцтвах, падчас мінулагодняга сезона бярозавы сок-сырэц у ёмістасцях па пяць літраў прадаваўся і на гарадскіх рынках. Усяго насельніцтву ў мінулым годзе было рэалізавана 2,7 тысячы тон бярозавіку, што склала 10 працэнтаў ад нарыхтаванага.

Сяргей РАСОЛЬКА

Калі ты праграміст — жыццё ў шакаладзе?

Рэйтынг прэстыжных прафесій узначальвае на сённяшні дзень у беларускім грамадстве прафесія праграміста. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага кампаніяй HeadHunter Беларусь (праект RABOTA.TUT.BY). На карысць праграмістаў выказаліся 46% рэспандэнтаў. На другое месца ўдзельнікі апытання паставілі бізнэсменаў і ўладальнікаў уласнага бізнэсу (43%), а на трэцяе — топ-менеджараў і наёмных дырэктараў кампаній (31%).

Беларусы лічаць, што быць банкірам ці служачым банка (19%) больш прэстыжна, чым, напрыклад, дыпламатам (15%), прадстаўніком творчай прафесіі (12%), урачом або фармацэўтам (9%). А замыкаюць топ-5 прэстыжных прафесій міністры, дэпутаты і дзяржаўныя службоўцы, за якіх выказаліся 16% рэспандэнтаў.

На думку большасці апытаных, прэстыж прафесіі вызначаецца ў першую чаргу высокай заработнай платай (83%) і запатрабаванасцю на рынку працы (58%). Відаць па ўсім, гэтым параметрам у найбольшай ступені адпавядаюць менавіта прафесіі праграміста і топ-менеджара?

А вось карысць, якую прыносіць грамадству прадстаўнік той ці іншай прафесіі, пры вызначэнні прэстыжу прафесіі значэння для беларусаў не мае: гэты параметр узгадалі толькі 18% апытаных, затое 36% прыгадалі камфортныя ўмовы працы, а 29% — работу ў міжнароднай кампаніі. Пры такім падыходзе ці варта здзіўляцца, што ў самым нізе рэйтынгу аказалася прафесія педагога. Прэстыжнай яе лічаць усяго 2 працэнты апытаных.

Усяго апытаннем былі ахоплены 543 рэспандэнты (прадстаўнікі 18 прафесійных галін). Цікава, што колькасць тых, хто лічыць сваю прафесію прэстыжнай, і тых, хто прытрымліваецца супрацьлеглага меркавання, прыкладна аднолькавая.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сардэчна віншуем Алену Мікалаеўну ЛЫСЮК з днём нараджэння! Зычым моцнага здароўя на доўгія гады, бадзёрасці, дабра і дабрабыту, поспехаў ва ўсіх тваіх справах. Добрага настрою і ўдачы. Хай жа спраўдзяцца твае мары на шчасце і Бог бережэ.

Бацька Мікалай Аляксеевіч, дачка Вольга, Вольга Сямёнаўна.

Информация об открытом акционерном обществе «Гастроном «Блеск» за 2012 год

УНН 190374944

Адрес Общества: 220019, г. Минск, ул. Шаранговича, 51, т./факс 201-62-74
Вид деятельности: эксплуатация и сдача в наем собственного имущества
Полное ф.и.о. руководителя: Люблинская Евгения Геннадьевна
Полное ф.и.о. гл. бухгалтера: Печур Любовь Николаевна

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2013 г.

млн руб.

АКТИВ	Код строки	На 31 декабря 2012 г.	На 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
1. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:	110	4949	3561
Нематериальные активы	120	-	-
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе: инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ 1	**190**	**4949**	**3561**
2. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	1	12
В том числе: материалы	211	1	12
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	1	1
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	1	2
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	40	85
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	808	371
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу 2	**290**	**851**	**471**
БАЛАНС	**300**	**5800**	**4032**
3. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	1113	1113
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	5	1
Добавочный капитал	450	4338	2884
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	202	18
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу 3	**490**	**5658**	**4016**
4. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу 4	**590**	**-**	**-**
5. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	142	16
В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	-	-
по авансам полученным	632	-	-
по налогам и сборам	633	26	1
по социальному страхованию и обеспечению	634	7	3
по оплате труда	635	15	6
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	94	6
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу 5	**690**	**142**	**16**
БАЛАНС	**700**	**5800**	**4032**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 01.01.2013 г.

млн руб.

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2012 года	За январь–декабрь 2011 года
1	2	3	4
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	730	5731
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	-	(4675)
Валовая прибыль (010-020)	030	730	1056
